Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
14 ЛІПЕНЯ 2017 г. ПЯТНІЦА №133 (28497)
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**ВНУ вызначылі кошт ведаў**
СТАР. 3



**Вёска, людзі, норавы…**
СТАР. 13



**Праграма тэлебачання на тыдзень**
**20 КАНАЛАЎ**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Таццяна СТАРЫНСКАЯ, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы і сацыяльных пытаннях:**

*«Тыя, хто прыйшоў у парламент з сацыяльнай службы, гатовыя ўнесці ініцыятыву аб тым, як павысіць адказнасць працаздольных дзяцей за састарэлых бацькоў. Па законе яны павінны даглядаць сваіх бацькоў. Але бывае, што дзеці проста прывозяць пажылога чалавека ў цэнтр сацабслугоўвання і кажуць: маўляў, рабіце што хочаце, вы — сацыяльная служба, і вы павінны. І гэта пры тым, што кошт сацыяльных паслуг вельмі нізкі».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.07.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9726 | ▼ |
| Еўра | 2,2514 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0327 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0758 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Віцебскія эцюды




Фота Віктара НІКАЛАЕВА.

■ Год навукі: медыцына

## ЗНАЙСЦІ І АБЯСШКОДЗІЦЬ

### Якія праекты ў галіне анкалогіі рэалізуюцца ў нашай краіне?

**Фундаментальныя навуковыя даследаванні ў галіне анкалогіі праводзяць РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, РНПЦ дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі, медыцынскія вучэбныя ўстановы, а таксама прыватныя кампаніі, напрыклад СТАА «Націвіта». Праекты ажыццяўляюцца ў галіне прафілактыкі, дыягностыкі і лячэння. Распрацоўваецца, напрыклад, тэхналогія атрымання і прымянення індывідуальных вакцын супраць анкалагічных захворванняў. Займаецца гэтым адразу некалькі арганізацый, у тым ліку прыватная і замежная кампаніі. Падобныя даследаванні настолькі затратныя, што праводзіць іх у адзіночку не ўяўляецца магчымым. Аб тым, што яшчэ прыцягвае ўвагу айчынных вучоных і ці шмат маладых спецыялістаў уцягваецца ў навуковую дзейнасць, расказваюць удзельнікі круглага стала.**

***— Наколькі актуальная для Беларусі тэма ўласных навуковых распрацовак для анкалогіі?***

**Намеснік дырэктара па навуковай рабоце Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава Сяргей КРАСНЫ:**

— У Беларусі назіраецца ўстойлівы рост анкалагічнай захваральнасці — штогод выяўляецца каля 50 тысяч новых выпадкаў злаякасных новаўтварэнняў, і гэта лічба прырастае прыкладна на 1 тысячу ў год.

СТАР. 4

■ На слыху

## АТРЫМАЙЦЕ І РАСПІШЫЦЕСЯ

### Дзіцячыя дапамогі цяпер будуць пераразлічвацца двойчы ў год



**Хто зможа атрымліваць даплату да дапамогі па цяжарнасці і родах? Ці могуць прызначыць дапамогу па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў іншым сваякам (не бацькам дзіцяці), калі яны не знаходзяцца ў працоўных адносінах, і якія ўмовы для гэтага павінны быць выкананы? У Беларусі прыняты Закон «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей». Разгледзім асноўныя яго навацыі.**

Новым законам замацавана, што дзяржаўныя дапамогі прызначаюцца на дзяцей пры ўмове, калі на дзень звароту па дапамогу тыя зарэгістраваны па месцы жыхарства (месцы знаходжання) і фактычна пражываюць у Беларусі.

Жанчыны, якія сталі на ўлік да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці не ў дзяржаўных, а ў іншых арганізацыях аховы здароўя, цяпер таксама маюць права на атрыманне аднаразовай дапамогі, прадугледжанай у сувязі з пастановай на такі ўлік.

Уведзена даплата да дапамогі па цяжарнасці і родах асобным катэгорыям жанчын, якія атрымліваюць гэту дапамогу ў мінімальным памеры.

Прадастаўлена права на дапамогу па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў іншым сваякам дзіцяці (не яго бацькам), калі яны, былўшы індывідуальнымі прадпрымальнікамі, натарыусамі, адвакатамі, рамеснікамі, асобамі, якія ажыццяўляюць дзейнасць у сферы аграэкатурызму, спынілі сваю дзейнасць у сувязі з доглядам дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў. Раней такія асобы мелі права на такую дапамогу, толькі калі знаходзіліся ў працоўных адносінах і афармілі водпуск па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту 3 гадоў.

Памер дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў будзе пераразлічвацца замест чатырох разоў — два разы на год (з 1 лютага і з 1 жніўня). У выпадку змяншэння сярэднямесячнай зарплаты работнікаў у краіне, з якой налічваецца такая дапамога, яе памер будзе заставацца на ранейшым узроўні.

СТАР. 3

# КУРС НА СУМЕСНЫЯ ВЫТВОРЧАСЦІ

**У сталіцы адбылася сустрэча прадстаўнікоў беларускага бізнесу з прэзідэнтам Малдовы Ігарам Дадонам. З беларускага боку на сустрэчы было больш за 40 удзельнікаў усіх сфер айчыннай эканомікі — ад флагманаў прамысловасці да прадстаўнікоў сярэдняга і малога бізнесу. Малдаўскі лідар прадставіў перспектыўныя кірункі двухбаковага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва і адказаў на пытанні.**

Перад дзвюма краінамі стаіць задача дасягнуць тавараабароту ў 400 млн долараў за два-тры гады пры цяперашнім тавараабароце ў 200 млн. **Намеснік прэм'ер-міністра Міхаіл РУСЫ** паведаміў, што пры гэтым наша краіна разлічвае нарасціць свой экспарт на 20—30%. Для рэалізацыі такой мэты ўжо падрыхтавана дарожная карта, а праблемныя пытанні плануецца абмяркоўваць двойчы ў год на ўзроўні міжурадавай камісіі.

**Старшыня беларускай гандлёва-прамысловай палаты Уладзімір УЛАХОВІЧ** нагадаў, што ў Беларусі і Малдовы ёсць традыцыйныя сферы і галіны, па якіх мы супрацоўнічаем ужо два дзясяткі гадоў. «Пры гэтым сёння перад намі ляжаць перспектывы развіцця сумесных зборачных вытворчасцяў. Мы чакаем, што запрацуе зборачная вытворчасць аўтобусаў МАЗ. Гэтая тэхніка сёння вельмі патрэбна нашым партнёрам. Іх цікавіць і вытворчасць МТЗ», — сказаў Уладзімір Улаховіч. Кіраўніцтва Малдовы таксама зацікаўлена ў развіцці супрацоўніцтва ў аграрным сектары і вытворчасці прадуктаў харчавання. «Тут мы можам даць нашым партнёрам магчымасць працаваць сумесна на вялікім рынку ЕАЭС. Мы зможам разам прасоўваць нашу прадукцыю і на рынкі ЕС», — рэзюмаваў старшыня БелГПП.

**Прэзідэнт Малдовы Ігар ДАДОН** пагадзіўся з тым, што Беларусь і Малдову ў будучыні чакаюць агульныя цікавыя праекты. «У красавіку сёлета Малдова падпісала мемарандум аб супрацоўніцтве з ЕАЭС. Мы падалі заяву і хутчэй за ўсё ў кастрычніку атрымаем статус назіральніка. Гэта азначае, што ў найбліжэйшы час паміж нашымі краінамі акрамя тых дамоўленасцяў, якія ёсць у рамках СНД, будзе магчымасць супрацоўнічаць па лініі ЕАЭС. З пункту гледжання перспектыў для бізнесу адкрываюцца новыя магчымасці», — падкрэсліў малдаўскі лідар.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

■ Парламенцкі дзённік

# Праца без меж

**Удзельнікі міжнароднага маладзёжнага прафсаюзнага форуму «ТЕМП-2017. Трудом Едина Молодежь Профсоюзов», які нядаўна завяршыўся ў Мінску, сустрэліся ў Палацы прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі з віцэ-спікерам Баляславам Пірштуком. Маладыя людзі азнаёміліся з тым, як працуюць беларускія заканадаўцы, а таксама змаглі задаць свае пытанні.**

У працэсе форуму ўдзельнікі з розных краін абмяняліся вопытам па працаўладкаванні моладзі. **Начальніка галоўнага ўпраўлення па культуры і грамадскай працы Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Глеба ЛАПІЦКАГА** зацікавіла практыка яго прыбалтыйскіх калег. «Латвія, Літва, Эстонія — тыя краіны, якія вельмі добра падтрымліваюць сваіх маладых спецыялістаў на першым працоўным месцы. Калі мы пачынаем абменьвацца вопытам і інавацыямі, то нашы суседзі таксама бяруць сабе на ўзбраенне нашы напрацоўкі па настаўніцтве. Я маю на ўвазе тое, што калі чалавек прыходзіць на першае працоўнае месца, да яго варта прымацоўваць настаўніка. Мы лічым, што гэта эфектыўная практыка», — расказаў Глеб Лапіцкі.

Таксама ён адзначыў, што асаблівае стаўленне беларускіх прафсаюзаў склалася да расійскіх калег. «Мы вельмі цесна супрацоўнічаем і ў міжнароднай арганізацыі працы, пастаянна падтрымліваем адно аднаго на ўсіх міжнародных пляцоўках. Плануецца, што вынікам нашага форуму стане рэзалюцыя, якую мы накіруем у камісію Міжнароднай арганізацыі працы ў Жэневе. Акрамя таго, мы спадзяёмся, што ў 2018-м усе прафцэнтры, якія прыязджалі ў Мінск, прывязуць з сабой у Жэневу на міжнародную арэну моладзь, для якой мы будзем прасіць спецыяльную пляцоўку. Там збярэцца больш за 180 краін», — расказаў Глеб Лапіцкі.

**Прадстаўнік прафсаюзаў Індыі Раяпанені Харэ КРЫШНА** лічыць, што на гэтым форуме ва ўсіх удзельнікаў ёсць магчымасць дзяліцца ідэямі па многіх пытаннях. «Я хачу данесці гэтыя ідэі прадстаўнікам прафсаюзаў і прадстаўнікам працоўнага класа Індыі. У нашай краіне мы сутыкаемся з мностам праблем у плане працаўладкавання моладзі. Тут мы вучымся іх вырашаць», — падзяліўся прадстаўнік Індыі.

Міжнародны прафсаюзны адукацыйны форум праводзіцца айчыннай Федэрацыяй прафсаюзаў у Мінску з 2015 года. Пачынаўся ён з удзелу 8 краін, а ў 2017 годзе на форум з'ехалася прафсаюзная моладзь ужо з 14 дзяржаў: В'етнама, Ізраіля, Індыі, Казахстана, Латвіі, Літвы, Малдовы, Расіі, Таджыкістана, Турцыі, Узбекістана, Украіны, Эстоніі і Беларусі.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by* ■

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## Макрон вінаваціць Германію ў атрыманні выгады ад дысбалансу ў ЕС



Эканамічны дысбаланс паміж краінамі еўразоны працягвае ўзмацняцца, і Германія атрымлівае выгаду ад гэтага, што з'яўляецца няправільным, заявіў прэзідэнт Францыі Эмануэль Макрон.

У цяперашні час «краіны (ЕС), у якіх ужо ёсць доўг, набіраюць яшчэ больш абавязацельстваў, у той час як канкурэнтаздольныя дзяржавы толькі ўмацоўваюць свае пазіцыі», заявіў ён у інтэрв'ю выданню Waz. Германія адносіцца да «пераможцаў» — яна змагла правесці рэформы і цяпер «выйграе ад дысбалансаў у еўразоне», заявіў французскі лідар, адзначыўшы, што гэта не ідзе на карысць усяму Еўрасаюзу. Паводле слоў Макрона, ён хацеў бы бачыць еўразону больш гамагеннай. Для гэтага Еўрасаюзу неабходна распрацаваць механізмы, якія зробяць фінансавую сітуацыю ў садружнасці больш справядлівай. «Гэта ключ да ўстойлівага саюзу, — лічыць Макрон. — Нам патрэбна еўразона з агульным бюджэтам, урадам, які будзе размяркоўваць гэты бюджэт і ажыццяўляць дэмакратычны кантроль, якога сёння не існуе».

## НАТА падазраюць у заахвочванні тэрарызму

Публікацыя НАТА відэароліка аб так званых лясных братах кажа пра тое, што ў краінах альянсу пачынае дамінаваць фашысцкая ідэалогія. Такое меркаванне ў гутарцы з журналістамі выказаў намеснік старшыні камітэта Дзярждумы па справах СНД, еўразійскай інтэграцыі і сувязях з суайчыннікамі Віктар Вадалацкі.

«НАТА сёння становіцца на бок злачынцаў, фашыстаў. Гэта вельмі сумны сігнал для ўсёй сусветнай супольнасці», — сказаў парламентарый. «Сёння тое, што адбываецца ў Польшчы, у Германіі, Францыі, калі ўзрываюць людзей, гэта якраз тое, што рабілі «лясныя браты», — падкрэсліў ён. — Атрымліваецца, што кіраўнікі НАТА (...) заахвочваюць тэрарызм на сваёй тэрыторыі». Раней, у чацвер, віцэ-прэм'ер Расійскай Федэрацыі Дзмітрый Рагозін, каментуючы ролік, заявіў, што ў асобе НАТА Расія мае справу з «нашчадкамі гітлераўскіх недабіткаў». На яго думку, краіны Паўночнаатлантычнага альянсу канчаткова сталі нахабнымі.

У васьміхвілінным відэа ўдзельнікі незаконных узброеных фарміраванняў, якія актыўна змагаліся з савецкай уладай у 1940—1950-х гадах на тэрыторыі Эстоніі, Латвіі і Літвы, малююцца героямі і вызваліцелямі. У запісе таксама анансуецца прысвечаны ім фільм.

## Галандскія турэмшчыкі незадаволеныя рэжымам зняволеных

Турэмныя работнікі Нідэрландаў абурыліся занадта лёгкім, на іх думку, рэжымам у пенітэнцыярных установах краіны, паведамляе The Independent.



Згодна з новымі правіламі, зняволеным раздаюць ключы ад камер і яны могуць свабодна пакідаць іх з умовай вярнуцца да 21.30 па мясцовым часе. «Нагляду за імі вельмі мала. Зняволеныя могуць рабіць што хочуць без усялякага назірання. Праблема ў тым, што яны могуць весці свае цёмныя справы, размаўляць без перапынкаў. І наркотыкамі гандляваць лягчэй», — сказаў Роб Мінкс, старшыня працоўнага савета дэпартамента пенітэнцыярных установ. Паводле яго слоў, эксперыменты па дачы зняволеным большай свабоды паступова распаўсюджваюцца на ўсю краіну, але ніякай навуковай базы пад гэтым няма. У Галандыі засталося ўсяго 11,6 тысячы зняволеных на 17 мільёнаў насельніцтва — з-за гэтага многія турмы прыйшлося закрыць. Акрамя таго, у верасні 2016-га ўлады краіны завезлі 240 асуджаных з Нарвегіі, каб забяспечыць працай пакінутыя ўстановы.

## Майка з піктаграмай

**Стартаваў конкурс на распрацоўку футболкі на тэму «яснай мовы».**

Дызайнерам прапануюць распрацаваць прынт на майку, у аснове якога будзе ляжаць стылізацыя класічных піктаграм на тэму ўзаемадзеяння паміж людзьмі ў сучасным грамадстве. Конкурс праводзіць Беларуская палата моды сумесна з ПРААН у Беларусі пры падтрымцы Беларускай асацыяцыі дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам.

Каб было лягчэй наладзіць кантакт з людзьмі з асаблівасцямі ў развіцці, у сусветнай практыцы выкарыстоўваецца альтэрнатыўная камунікацыя — гэта камунікацыя з дапамогай розных невербальных сродкаў, найбольш папулярныя з якіх — графічныя. Карцінныя сімвалы ўяўляюць сабой двухмерныя чорна-белыя ці каляровыя малюнкі з подпісамі. Яны лёгка інтэрпрэтуюцца, адназначна паказваюць на прадметы, дзеянні ці сітуацыі і не патрабуюць валодання пісьмовым ці вусным маўленнем.

Увасобіць у жыццё дызайнерскія рашэнні ўдзельнікаў конкурсу дапамажа кампанія Mark Formelle, якая выпусціць 10 відаў маек. Футболкі фіналістаў прымуць удзел у сацыяльным веламарафоне, што адбудзецца ў жніўні гэтага года. Той, хто прадставіць найлепшае дызайнерскае рашэнне па стылізацыі сімвалаў і тэкстаў на «яснай мове», атрымае смартфон ад кампаніі Huawei. Да ўдзелу запрашаюцца беларускія дызайнеры адзення і графічныя дызайнеры. Заяўкі прымаюцца **да 20 ліпеня** на адрас design@bfw.by.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

# ДЗІЦЯЧЫ САДОК НА 200 МЕСЦАЎ АДКРЫЛІ Ў ГЛЫБОКІМ

**Установа разлічана на дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту, тут плануецца размясціць 12 груп: па тры — ранняга ўзросту, або ясельнага, малодшыя і сярэднія, дзве старшыя групы і адзін клас. Сам будынак складаецца з адмысловых функцыянальных блокаў, сярод якіх — медыцынскі корпус, харчаблок, басейн, фізкультурна-аздараўленчы корпус і блок эстэтычнага выхавання. У цырымоніі адкрыцця прыняў удзел старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА.**



Фота БЕЛТА.

— Беларусь з'яўляецца адным з лідараў па развіцці дашкольнай адукацыі і выхавання, а таксама дзіцячай аховы здароўя, — адзначыў спікер ніжняй палаты беларускага парламента. — Дзеці, іх патрэбы, дабрыты — гэта тыя пытанні, якія пастаянна знаходзяцца ў полі зроку Прэзідэнта, органаў выканаўчай, заканадаўчай улады.

Уладзімір Андрэйчанка таксама дадаў, што сёння ў нашай краіне шмат робіцца для маладых сем'яў, асабліва для тых, якія сапраўды маюць патрэбу ў дапамозе. І за апошнія гады ў Беларусі павялічылася колькасць сем'яў, у якіх выхоўваюцца два і больш дзіцяці.

Новы дзіцячы сад вырашыць праблему недахопу месцаў і перапоўненасці ў іншых установах у горадзе, паколькі з'явілася магчымасць забяспечыць месцамі ўсіх дашкольнікаў мікрараёна вуліцы Паўночнай — сёння тут пражывае 324 дзіцяці ва ўзросце ад 0 да 6 гадоў. Акрамя таго, больш за 120 дзяцей з 6 іншых устаноў зможа перайсці ў новы садок.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

## ТЭЛЕФАНУЙЦЕ — ВАМ АДКАЖУЦЬ

**Заўтра, 15 ліпеня, на традыцыйных прамых лініях у аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме, якія штотыдзень праходзяць па суботах з 9.00 да 12.00, на звароты і пытанні грамадзян будуць адказваць:**

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама САКОЎСКІ Віктар Яўгенавіч. Тэл. 8 (016) 2213121;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама ПЕНІН Уладзімір Пятровіч. Тэл. 8 (021) 2222222;

старшыня ГОМЕЛЬСКАГА абласнога Савета дэпутатаў БАРЫСЕНКА Алег Леанідавіч. Тэл. 8 (023) 2751237;

старшыня ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама КРАЎЦОЎ Уладзімір Васілевіч. Тэл. 8 (015) 2735644;

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама КУНЦЭВІЧ Андрэй Міхайлавіч. Тэл. 8 (022) 2501869;

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама ПЛАЎСКІ Алег Альфрэдавіч. Тэл. 8 (017) 5004160;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама КРЭПАК Аляксандр Пятровіч. Тэл. 8 (017) 2224444.

■ Надвор'е

# Усе выхадныя — дажджы

**На гэтым тыдні надвор'е спачатку нас радавала. Нарэшце адчувалася лета: тэмпература паветра была на 1—3 градусы вышэйшая за кліматычную норму. Але ў канцы тыдня пад уплывам актыўных атмасферных франтоў надвор'е сапсавалася. Галоўны сіноптык службы гідраметэаралагічных прагнозаў Белгідраметцэнтра Святлана РЫБАКОВА паведаміла, што ў найбліжэйшыя дні нас чакаюць дажджы і паніжаны тэмпературны фон.**

Сёння днём па ўсходняй палове краіны пройдуць дажджы, у асобных раёнах Віцебскай вобласці — моцныя дажджы. Парывы ветру могуць узмацніцца да 15—20 м/с. Тэмпература складзе 14—19 градусаў цяпла, па паўднёвым захадзе — да 20—22 градусаў. На выхадных прагназуецца халаднаватае няўстойлівае надвор'е. У суботу, 15 ліпеня, у паўночна-ўсходніх раёнах і па паўднёвым захадзе чакаюцца дажджы. У цэнтральным рэгіёне і Мінску — без ападкаў. Тэмпература ночу — плюс 7—13 градусаў, удзень — 15—22 градусы. Такі ж тэмпературны фон будзе ў краіне і ў нядзелю. Днём пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі магчымы навальніцы.

На наступным тыдні надвор'е пачне паляпшацца. У панядзелак, 17 ліпеня, па паўночным захадзе чакаюцца кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Ноччу ўсё тыя ж 7—13 градусаў цяпла, а вось удзень тэмпература падымецца да 18—22 градусаў. Уначы ў аўторак будзе ўжо плюс 9—16, днём — плюс 22—27 градусаў.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by* ■

**Калектывы Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь і Рэспубліканскага навукова-даследчага ўнітарнага прадпрыемства «БелНДЦ «Экалогія» выказваюць глыбокае спачуванне Мяльнову Сяргею Барысавічу ў сувязі з напаткаўшым яго горам — смерцю БАЦЬКІ.**

# АТРЫМАЙЦЕ І РАСПІШЫЦЕСЯ

**Закон уступіў у сілу з 1 ліпеня гэтага года, за выключэннем новаўвядзення, якое датычыцца перыядычнасці пераразліку памераў дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў — яно ўступіць у сілу з 1 жніўня гэтага года.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Урэгуляваны парадак прызначэння аднаразовай дапамогі ў сувязі з нараджэннем дзіцяці замежным грамадзянам, што прыбылі ў Беларусь, а таксама грамадзянам Беларусі, якія зарэгістраваныя ў нашай краіне, але пражываюць за яе межамі.

Для таго каб часова пражываючыя ў нашай краіне замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства атрымалі права на прызначэнне дапамогі ў сувязі з нараджэннем дзіцяці, перыяд выплаты імі абавязковых страхавых унёскаў на сацыяльнае страхаванне павінен складаць не менш за 6 месяцаў; для грамадзян Беларусі ў выпадку нараджэння дзіцяці за мяжой — неабходна пражыванне аднаго з бацькоў у краіне не менш за 6 месяцаў.

Удакладнена права на атрыманне дзяржаўнай дапамогі пры знаходжанні дзяцей-інвалідаў у інтэрнаце ў перыяд аказання сям'і паслугі сацыяльнай перадышкі (такая паслуга можа прадастаўляцца сям'і на тэрмін да 28 каляндарных дзён у годзе).

Будзе праводзіцца выплата дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў у поўным памеры індывідуальным прадпрымальнікам і іншым асобам, якія самастойна выплачваюць абавязковыя страхавыя ўзносы, калі яны знаходзяцца ў працэсе спынення прадпрымальніцкай дзейнасці альбо прыпынілі яе па прыгаворы суда, або ў сувязі з прыпыненнем ліцэнзіі на ажыццяўленне дзейнасці.



Фота БЕЛТА.

Прадастаўлена права на атрыманне дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў у поўным памеры пры праходжанні падрыхтоўкі ў клінічнай ардынатуры ў вочнай форме за кошт уласных сродкаў.

Уведзена новая катэгорыя сем'яў, якія маюць права на дапамогу на дзяцей, старэйшых за 3 гады, — гэта будуць таксама сем'і, у якіх бацька (айчым) праходзіць альтэрнатыўную службу.

Сем'і, у якіх бацькі з'яўляюцца інвалідамі I або II групы або адзін з бацькоў з'яўляецца інвалідам I групы, а другі ажыццяўляе догляд за ім з атрыманнем дапамогі па доглядзе, будуць мець права на дапамогу на дзяцей, старэйшых за 3 гады, да дасягнення дзецьмі ўзросту 18 гадоў без якіхсьці ўмоў да іх навучання. Гэта значыць, што такія сем'і змогуць атрымліваць дапамогу на дзяцей, якія навучаюцца на бюджэтнай аснове, на завочнай (дыстанцыйнай) або вячэрняй форме навучання, і на дзяцей, якія спынілі навучанне пасля заканчэння школы.

Бацькі, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, цяпер будуць мець права атрымліваць дапамогу па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў і адначасова працаваць на 0,5 стаўкі або выконваць працу дома. Таксама бацькі дзіцяці-інваліда будуць мець права на дапамогу па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў і ў выпадку атрымання імі пенсіі альбо штомесячнай страхавой выплаты ад Белдзяржстраха (да гэтага такое права мелі толькі бацькі з інваліднасцю).

Павышаецца памер дапамогі па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў да 120% бюджэту пражыткова мінімуму для асоб, якія ажыццяўляюць догляд дзіцяці-інваліда ва ўзросце ад 3 да 18 гадоў з III або IV ступенню страты здароўя.

Прадастаўлена права бацькам (усынавіцелям, апекунам, папячыцелям) дзіцяці-інваліда на атрыманне дапамогі па часовай непрацаздольнасці па доглядзе дзіцяці-інваліда на перыяд яго санаторна-курортнага лячэння, медыцынскай рэабілітацыі — у тых выпадках, калі атрымальнікам дапамогі па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў з'яўляецца іншая асоба або другі з бацькоў, якія не змогуць ажыццяўляць догляд дзіцяці-інваліда ў гэты перыяд па аб'ектыўных прычынах.

Павялічаны тэрмін для звароту па прызначэнне дапамогі ў сувязі з нараджэннем дзіцяці для ўсынавіцеляў (удачарыцеляў) і апекуноў, пры ўсынаўленні, устанаўленні апекі над дзіцем ва ўзросце да 6 месяцаў (устаноўлены для падачы заявы 6-месячны тэрмін будзе вылічацца не з дня нараджэння дзіцяці, а з дня ўсынаўлення, устанаўлення апекі).

У адпаведнасці з законам атрымальнікі дзярждапамог абавязаны паведамляць не пазней за 5 дзён пра надыход абставін, якія цягнуць за сабой спыненне выплаты дзяржаўных дапамог. У гэтым выпадку выплата дапамогі будзе спыняцца з наступнага месяца, пры парушэнні дадзенага тэрміну — з дня наступлення такіх абставін.

Калі дзіця нараджае непаўналетняя маці і на яе на саму прызначана дапамога, то ў выпадку нараджэння ёю дзіцяці без рэгістрацыі шлюбу выплата на яе дапамогі працягнецца.

• У тэму

## Крыху аб страхавым стажы шматдзетных маці

**Указ Прэзідэнта ад 29 чэрвеня гэтага года №233 «Аб пенсійным забеспячэнні асобных катэгорый грамадзян» знізіў страхавы стаж (стаж працы з выплатай абавязковых страхавых унёскаў на дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне) для некаторых катэгорый грамадзян, але пакінуў без змен страхавы стаж для шматдзетных маці.**

Як заявілі ў Мінпрацы і сацыяльнай абароны, Указам №233 прадугледжана зніжэнне да 10 гадоў страхавога стажу грамадзянам, якія не адпрацавалі неабходнага страхавога стажу, паколькі доўга займаліся іншай дзейнасцю: напрыклад, даглядалі малалетніх дзяцей, вучыліся на дзённым аддзяленні, праходзілі ваенную службу, даглядалі непрацаздольных.

Іншая дзейнасць грамадзян тут не ўлічваецца. Так, напрыклад, права на працоўную пенсію ніколі не давалася і не можа давацца за вядзенне ўласнай хатняй гаспадаркі.

Падыходы да вылічэння страхавога стажу з прыняццем Указа не змяніліся: гэта толькі перыяды работы (прадпрымальніцкай, творчай дзейнасці) з выплатай абавязковых страхавых унёскаў.

Што датычыцца ўключэння ў стаж перыядаў догляду за малалетнім дзіцем, то, згодна з пунктам «в» артыкула 51, у стаж уключаюцца перыяды водпуску па доглядзе дзіцяці і доглядзе дзяцей да дасягнення імі ўзросту 3 гадоў (але не больш за 9 гадоў увогуле).

Разам з тым у міністэрстве адзначаюць, што наяўнасць гэтай нормы не азначае, што кожнай маме ў абавязковым парадку стаж павялічваецца на тры гады за кожнае дзіця. Пры вылічэнні стажу ўлічваецца, ці працуе мама на дату нараджэння дзіцяці, і даты нараджэння наступных дзяцей. Калі мама на дату нараджэння дзіцяці знаходзіцца ў працоўных адносінах, у стаж уключаецца яе праца да і пасля водпуску па доглядзе дзіцяці (як стаж працы з выплатай унёскаў), а таксама непасрэдна сам водпуск па доглядзе дзіцяці да трохгадовага ўзросту, так званы дэкрэтны адпачынак — на падставе загаду наймальніка аб пачатку і заканчэнні водпуску. Калі мама выйшла на работу датэрмінова, да заканчэння водпуску, час догляду дзіцяці таксама лічыцца да выхаду на работу.

Калі ж мама на дату нараджэння дзіцяці не працуе, у стаж уключаецца час догляду дзіцяці да дасягнення ім трохгадовага ўзросту (па пасведчанні аб нараджэнні). Калі мама пры гэтым працаўладкавалася раней дасягнення дзіцем узросту 3 гадоў, час догляду таксама ўключаецца ў стаж толькі да яе выхаду на работу.

Гэта значыць, што перыяды (работы і / або догляду), якія супадаюць па часе, улічваюцца пры вылічэнні стажу толькі адзін раз. Гэта актуальна і для выпадкаў, калі догляд ажыццяўляўся адначасова за некалькімі дзецьмі, якія нарадзіліся з інтэрвалам менш за тры гады. Так, напрыклад, пры нараджэнні двайнят перыяд догляду за двума дзецьмі будзе залічаны ў стаж у каляндарным парадку толькі адзін раз, як догляд за адным дзіцем.

У шматдзетных сем'ях, як правіла, дзеці нараджаюцца без значных перапынкаў паміж нараджэннямі. Таму максімальны 9-гадовы перыяд можа ахопліваць час догляду мамы за чацвёртым, пятым і нават наступнымі дзецьмі.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

# Культурны форум сусветнага маштабу

**Учора, 13 ліпеня, адбылося ўрачыстае адкрыццё XXVI Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». У якасці ганаровых гасцей былі запрошаны Прэзідэнт Малдовы Ігар Дадон, прадстаўнікі афіцыйных дэлегацый краін і рэгіёнаў Расіі, удзельнікі XIX Сусветнага кангрэса рускай прэсы.**

**Віцэ-прэм'ер Васіль ЖАРКО, старшыня арганізацыйнага камітэта фестывалю,** канстатаваў, што, дзякуючы беларускаму Прэзідэнту, «Славянскі базар» ператварыўся ў сусветны культурны форум з ахопам удзельнікаў практычна з усіх кантынентаў. На ім выступаюць самыя вядомыя зоркі мастацтваў.

— Аўтарытэт фестывалю павялічваецца. Гэта сведчыць аб паслядоўнай дзяржаўнай палітыцы ў галіне культуры, — адзначыў ён.

Паралельна ўзрастае самаакупнасць фэсту. Летась яна склала 86%. І сёлета, па папярэдніх прагнозах, будзе вышэйшая.

**Аляксандр СІДАРЭНКА, кіраўнік дырэкцыі «Славянскага базару»,** падкрэсліў, што ўсё больш купляюць білетаў. Просьбы, заўвагі гледачоў і журналістаў улічваюцца пры фарміраванні праграмы на наступны фестываль.

Сёння ўвечары адбудзецца паўфінал конкурсу маладых выканаўцаў эстраднай песні.

**Намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ** паведаміў што, дзякуючы прадстаўнікам СМІ, якія бяруць удзел у Сусветным кангрэсе рускай прэсы, колькасць журналістаў на фестывалі павялічыцца на пару сотняў. Да таго як наведаць Віцебск, удзельнікі кангрэса пабывалі ў «калысцы гарадоў беларускіх» — старажытным Полацку.

Творчасць самых актыўных прадстаўнікоў «чацвёртай улады» штогод адзначаецца на фестывалі ўручэннем падзяк ад Міністэрства інфармацыі і дырэкцыі фэсту. Сёлета сярод лаўрэатаў і рэдакцыя «ЛіМ», выданне Выдавецкага дома «Звязда». Віншуем калег!

### Перамога беларускі!

**Юная прадстаўніца Беларусі Маша Магільная на музычным конкурсе «Славянскага базару» стала ўладальніцай Гран-пры (5 тысяч долараў). Прыемную навіну агучылі ўчора на гала-канцэрце дзіцячага творчага спаборніцтва.**



Фота БЕЛТА.

**Прадстаўнік Арменіі заслужыў I прэмію (3 тысячы долараў).**

**II прэмію (2 тысячы долараў) падзялілі паміж канкурсантамі з Балгарыі і Казахстана.**

**А III прэмію (1 тысячу долараў) — паміж талентамі з Расіі і Македоніі.**

Галоўную ўзнагароду ад дырэкцыі — «Залатое пяро» — атрымала супрацоўніца газеты «Маскоўскі камсамолец» Таццяна Фядоткіна. Яна — аўтар больш як 100 публікацый, прысвечаных «Славянскаму базару».

На вуліцах правіць баль фестываль вулічнага мастацтва «На сямі вятрах».

У суботу адбудзецца пасяджэнне савета дырэктараў Сусветнай асацыяцыі фестываляў. У эпіцэнтры ўвагі — Дзень моладзі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

■ Кошт ведаў

# ЖУРНАЛІСТА ПАДРЫХТАВАЦЬ ДАРАЖЭЙ, ЧЫМ ФІЛОЛАГА?

**Беларускія ВНУ агучылі кошт навучання для першакурснікаў на 2017/2018 навучальны год.**

У Беларускім дзяржаўным медыцынскім універсітэце год навучання на спецыяльнасцях «лячэбная справа», «педыятрыя» і «фармацыя» будзе каштаваць для беларусаў 2200 рублёў. Падрыхтоўка фармацэўтаў на завочнай форме навучання значна таннейшая — усяго 880 рублёў. А самае дарагое «задавальненне» — падрыхтоўка будучых стаматолагаў (2570 рублёў).

Але для замежных студэнтаў кошты ў БДМУ зусім іншыя — 4 тысячы долараў за год незалежна ад спецыяльнасці. А пры ўмове навучання на англійскай мове (а такая магчымасць таксама ёсць) ім давядзецца заплаціць яшчэ больш — ад 4900 да 5500 долараў.

Між іншым, калі яшчэ колькі гадоў таму медыцынская адукацыя лічылася ў нас адной з самых дарагіх, то сёння па цэнах лідзіруюць вострапатрабаваныя ў моладзі спецыяльнасці Белдзяржуніверсітэта і БДУІР. Насамрэч, ну хто з выпускнікоў не марыць пра кар'еру дыпламата ці спецыяліста ў буйной IT-кампаніі з добрым заробкам? Але за ажыццяўленне мары давядзецца заплаціць кругленькую суму, прычым гэта яшчэ зусім не гарантыя таго, што кар'ера потым складзецца так, як уяўлялася.

Напрыклад, у БДУ кошт навучання на факультэце міжнародных адносін вагаецца ад 2765 да 2851 рубля ў залежнасці ад спецыяльнасці, на юрыдычным факультэце — ад 2593 да 2851 рубля, на эканамічным складае 2765 рублёў. Дзіўна, але і ў Інстытуце журналістыкі цэны зашкальваюць: год навучання на спецыяльнасці «журналістыка» па ўсіх напрамках (акрамя аўдыявізуальнай) ацэнены ў 2593 рублі, на міжнароднай і аўдыявізуальнай журналістыцы — у 2708 рублёў. Атрымліваецца, што падрыхтаваць урача цяпер танней, чым майстра слова?

Пры гэтым кошт падрыхтоўкі на філалагічным факультэце на спецыяльнасцях «беларуская філалогія» і «руская філалогія» — самы нізкі ў БДУ (2030 рублёў). Відавочна, што попыт з боку абітурыентаў моцна ўплывае на «цэннік» на адукацыю...

Самы папулярны сярод абітурыентаў БДУІР — факультэт камп'ютарных сістэм і сетак. Тут за год навучання давядзецца заплаціць 2750 рублёў. Для ўсіх спецыяльнасцяў факультэта камп'ютарнага праектавання, факультэта радыётэхнікі і электронікі і факультэта тэлекамунікацый кошт складзе 2255 рублёў, для факультэта інфармацыйных тэхналогій і кіравання, інжынерна-эканамічнага факультэта — 2530 рублёў.

У БНТУ самае дарагое навучанне на архітэктурным факультэце — 2797 рублёў за год, а самае таннае — на спецыяльнасцях спартыўна-тэхнічнага, інжынерна-педагагічнага факультэтаў і асобных спецыяльнасцях прыборабудаўнічага і будаўнічага факультэтаў — 2429 рублёў.

Падаражэла навучанне і ў Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце. З верасня платнікі на першым курсе на дзённым аддзяленні будуць аддаваць 2210 рублёў у год. Іх папярэднікі ў мінулым годзе плацілі 2018 рублёў.

У Міністэрстве адукацыі тлумачаць: кошт навучання залежыць ад тарыфнай стаўкі першага разраду для аплаты працы работнікаў бюджэтных арганізацый, а таксама тарыфаў на паслугі (работы, тавары) для юрыдычных асоб, у тым ліку на камунальныя паслугі, паслугі сувязі і іншыя.

Вышэйшую адукацыю на ўмовах аплаты ў Беларусі атрымліваюць прыкладна палова ад агульнай колькасці студэнтаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

# ЗНАЙСЦІ І АБЯСШКОДЗІЦЬ


Сяргей КРАСНЫ.


Аляксей СЫЧОЎ.


Міхаіл БЕЛЕЎЦАЎ.


Аляксандр ПРОХАРАЎ.


Аляксандр ЖУКАВЕЦ.

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Такая тэндэнцыя прывядзе да таго, што праз 20 гадоў размова ўжо будзе ісці прыкладна аб 70 тысячах новых выпадкаў у год. Мы павінны быць да гэтага гатовыя, і таму сярод іншых кірункаў дзейнасці асаблівая ўвага ўдзяляецца навуковым даследаванням. Толькі ў нашым цэнтры штогод праводзіцца ад 60 да 70 навуковых праектаў, і ў першую чаргу трэба адзначыць распрацоўку і ўкараненне праграм скрынінгу (абследавання здаровых) злаякасных новаўтварэнняў.

Праграмы скрынінгу ў нашай краіне распрацаваны для пяці лакалізацый злаякасных пухлін, якія ахопліваюць каля 50 працэнтаў усіх выпадкаў пухлін. Іх, вядома, вельмі шмат, і абследаваць усё насельніцтва на ўсе пухліны немагчыма, дый эканамічна неабгрунтавана. Таму мы кажам пра скрынінг раку малочнай залозы, прастаты, шыйкі маткі, каларэктальны рак і рак лёгкага. Пры гэтым для кожнага віду раку вызначаны свае групы рызыкі, акрамя таго, скрынінг рэалізуецца не адразу па ўсёй краіне, а ў межах пілотных праектаў.

У Беларусі ўсяго 300 анколагаў, на якіх прыпадае 50 тысяч новых пацыентаў і 250 тысяч тых, што стаяць на ўліку. Таму калі вас нічога не непакоіць, то проста так ісці да ўрача-анколага не трэба. Іншая рэч, незалежна ад скрынінгу кожная жанчына ва ўзросце пасля 25—30 гадоў павінна раз у год абследавацца ў гінеколага з выкананнем мазка з шыйкі маткі. У найбліжэйшы час для такога даследавання ў кожнай вобласці з'явіцца апарат, здольны забяспечыць патрэбы вобласці ў правядзенні гэтага абследавання паводле новай методыкі — вадкаснай цыталогіі. Рак шыйкі маткі выклікае вірус папіломы чалавека. Інфіцыраванне адбываецца з пачаткам палавога жыцця, а анкалогія развіваецца праз 10—15 гадоў. Вось чаму яшчэ да пачатку палавога жыцця дзяўчынкам 11—12 гадоў рэкамендуецца прайсці вакцынацыю. Яна платная, але гэта стапрацэнтны сродак прафілактыкі. Што да ўсіх іншых катэгорый насельніцтва, то кожны дарослы павінен раз у год выконваць ультрагукавое абследаванне органаў брушной поласці і малога таза, здаваць агульны і біяхімічны аналіз крыві і праходзіць рэнтген лёгкіх.

Злаякасныя пухліны не праяўляюцца на ранніх стадыях ніякімі сімптомамі, а таму нашы намаганні павінны быць скіраваны на абследаванне здаровых людзей. Выяўляючы пухліны ў тых, хто ні на што не скардзіцца, можна дасягнуць вылечвання ў 95—100 працэнтах выпадкаў. Калі мы выяўляем маленькія пухліны, то ўжо не абавязкова выконваць велізарныя, траўматычныя аперацыі і прымяняць вельмі складаныя метады лячэння.

Другі вельмі важны кірунак нашых даследаванняў — распрацоўка малых інвазіўных тэхналогій, бо каля 20 працэнтаў выпадкаў злаякасных пухлін усё роўна выяўляюцца ў запушчанай стадыі. У свеце з'явілася велізарная колькасць вельмі дарагіх сучасных метадаў лячэння і лекавых сродкаў. Сёння мы вызначаем патэнцыяльную адчувальнасць да гэтых складаных лекаў — як да хіміяпрэпаратаў, так і да таргетных (мэтавых), якія ўздзейнічаюць на канкрэтную мутацыю. Вызначэнне патэнцыяльнай адчувальнасці дазваляе прызначаць іх мэтавай групе, а таксама падабраць індывідуальнае лячэнне кожнаму канкрэтнаму пацыенту. І тут не абысціся без малекулярна-генетычных даследаванняў, якія сталі магчымыя ў нас з увядзеннем Рэспубліканскай малекулярна-генетычнай лабараторыі канцэрагенезу і цэнтра пазітронна-эмісійнай тамаграфіі. Такое сучаснае абсталяванне выкарыстоўваецца сёння не толькі для клінічнага прымянення, але і для навуковых даследаванняў. Аднак даследаванні гэтыя вельмі дарагія, неабходна прыцягненне ўсіх магчымых крыніц фінансавання. Тут і дзяржаўны бюджэт, і сродкі самога цэнтра, што зарабляюцца дзякуючы лячэнню і дыягностыцы пацыентаў з іншых краін, і міжнародныя праекты, якія аб'ядноўваюць намаганні некалькіх краін, і прыцягненне прыватных сродкаў. З прыватнай кампаніяй «Націвіта» мы займаемся такім перспектыўным кірункам, як імунатэрапія злаякасных пухлін, стварэнне індывідуальных супрацьпухлінных вакцын.

> **У межах дзяржпраграм летась у краіне выконвалася каля 120 праектаў медыцынскай накіраванасці. На вырашэнне задач у галіне анкалогіі скіравана каля 40 праектаў. Асноўнай праграмай, дзе ўсе яны прадстаўлены, з'яўляецца Дзяржаўная навукова-тэхнічная праграма «Новыя метады аказання медыцынскай дапамогі».**

***— На якія распрацоўкі ў галіне анкалогіі звяртаюць сёння ўвагу прыватныя кампаніі?***

**Старшыня савета дырэктараў СТАА «Націвіта» Аляксей СЫЧОЎ:**

— У сферы нашых навуковых інтарэсаў змяненне самога падыходу да лячэння анкалагічных захворванняў. Цяпер людзі едуць на іншы кантынент па дарагое лячэнне. Мы чакаем, што дзякуючы нашым сумесным распрацоўкам такі спосаб лячэння стане даступным у Беларусі.

NatiVita — міжнародная навукова-вытворчая фармацэўтычная кампанія па распрацоўцы і выпуску інавацыйных лекавых сродкаў. Сёння мы ствараем персаніфікаваныя супрацьпухлінныя вакцыны для прафілактыкі і тэрапіі рэцыдываў злаякасных пухлін. Даследаванні скіраваны на распрацоўку тэхналогіі іх атрымання і прымянення вакцын, якія будуць вырабляцца з выкарыстаннем сучасных метадаў біятэхналогій і геннай інжынерыі. Праект рэалізуецца сумесна з навуковым цэнтрам BioMed у Славакіі. У праекце ўдзельнічаюць Віцебскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі. Сумесна з Віцебскім медуніверсітэтам укараняем тэхналогіі аднаўлення «паламанага» геному ў саматычных пухлінных клетках для спынення пухліннага росту (так званы імунітэт на ўзроўні генаў). Віцебскі медуніверсітэт і ТАА СІВітал працуюць над стварэннем дыягнастычных тэст-сістэм, якія дазволяць хутка правесці дыягностыку пухліннага працэсу з дапамогай перыферычнай крыві, забяспечыць прызначэнне індывідуальных таргетных прэпаратаў і кантраляваць іх эфектыўнасць. Сумесна з Цэнтрам геннай інжынерыі і біятэхналогій (Куба) РНПЦ анкалогіі правядзе клінічныя выпрабаванні стымулюючых імунную сістэму вакцын, скіраваных на лячэнне раку лёгкага, тоўстай і прамой кішкі, печані, яечнікаў і шыйкі маткі, падстраўнікавай залозы.

Любы фармвытворца адчувае дэфіцыт высокакваліфікаваных кадраў. Таму мы самі рыхтуем для сваёй кампаніі ў Віцебску спецыялістаў на курсе біятэхналогій. А пераможцаў алімпіяд па біятэхналогіях прыцягваем да стажыроўкі на прадпрыемствах, якія вырабляюць інавацыйныя прадукты, — у сябе, Расіі і іншых краінах.

***— Якія навуковыя праекты рэалізуюцца ў галіне дзіцячай анкалогіі?***

**Намеснік дырэктара па навуцы Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі Міхаіл БЕЛЕЎЦАЎ:**

— Тут таксама дыягностыка ўсё больш пераходзіць на выяўленне генетычных мутацый, якія суправаджаюць захворванне. Разам з РНПЦ анкалогіі працуем над стварэннем індывідуальных для кожнага пацыента ДНК-вакцын супраць лімфом. Каля 10 пацыентаў ужо атрымалі такую тэрапію, эфектыўнасць яе пацвярджаецца. Генна-інжынерная вакцына пры нейрабластоме праходзіць выпрабаванне на жывёлах, і праз год-два мы плануем прымяняць тэхналогію ў групах высокай рызыкі. Распрацоўваецца праект па генна-інжынернай тэрапіі для самых цяжкіх пацыентаў з лейкозам. У стадыі рэалізацыі знаходзіцца распрацоўка генна-інжынерных тэхналогій клетак, якія змогуць актывізаваць клеткі, што адказваюць за наш супрацьпухлінны імунітэт. Наша задача — нарасціць іх колькасць і ўвесці пацыенту. Працуем і над тым, каб выяўляць і выдаляць рэшткі пухлінных клетак, якія могуць даць рэцыдыў. У стадыі падрыхтоўкі — праграма Саюзнай дзяржавы пад агульнай назвай «Інавацыйныя метады рэабілітацыі дзяцей пасля анкалагічных захворванняў».

У апошнія 2—3 гады да нас прыйшло даволі шмат маладых вучоных — біёлагаў і медыкаў. Біёлагаў запрашаем яшчэ з ліку студэнтаў, прапануем застацца — умовы работы ў нас нядрэнныя. А вось у супрацоўніцтве з прыватнымі кампаніямі ёсць цяжкасці. Нам хацелася б, каб гэта было больш актыўна, для чаго патрабуецца рэгулюючая заканадаўчая база. Некалькі даследаванняў, праведзеных з удзелам прыватных кампаній, паказалі добрыя вынікі.

***— Якія веды атрымліваюць сёння студэнты-медыкі, і ці шмат іх займаецца навуковай дзейнасцю?***

**Загадчык кафедры анкалогіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Аляксандр ПРОХАРАЎ:**

— На кафедры анкалогіі навучаюцца студэнты 5-га і 6-га курсаў лячэбнага і педыятрычнага факультэтаў. Яшчэ 10 гадоў таму гэты курс быў малы, аднак з улікам таго, якую праблему пачала ўяўляць анкалагічная захваральнасць, колькасць гадзін і выкладчыкаў была павялічана. Хоць і гэтага недастаткова. Бо сёння анколаг павінен ведаць тэрапію, элементы хірургіі, радыялогіі — валодаць шырокімі ведамі... Навуковая студэнцкая суполка нашай кафедры — гэта дзесьці каля 25 чалавек, з якіх сур'ёзна падыходзяць да напісання навуковай работы чалавек 5—10. Глабальных даследаванняў з удзелам студэнтаў, мякка кажучы, малавата. Таму што медыцынскія ВНУ — гэта ўстановы адукацыі, у якіх недастаткова фінансавых сродкаў для правядзення навуковай работы. На штогадовых навуковых канферэнцыях студэнты і маладыя вучоныя агучваюць свае работы ў выглядзе дакладаў, пасля чаго яны падаюцца на рэспубліканскі студэнцкі навуковы конкурс. Звычайна да такой дзейнасці іх стымулюе размеркаванне, якое адбываецца паводле рэйтынга. Вышэйшы рэйтынг, а сюды ўваходзіць і падрыхтоўка навуковай работы, — прэстыжнейшыя спецыяльнасці, на якія можна прэтэндаваць. Аднак пасля размеркавання большасць адыходзіць ад навукі.

Глабальных міжнародных праектаў сёння ў нас няма. Пасля аварыі на ЧАЭС у нас сапраўды былі міжнародныя праекты, у прыватнасці, з японскімі калегамі па раку шчытападобнай залозы. Сёння мы імкнёмся цесна кантактаваць з РНПЦ анкалогіі, дзе ёсць выдатная тэхналагічная база, неабходная для сур'ёзных даследаванняў. У нас тут два дзеючыя праекты і адзін на перспектыву. Асноўны іх кірунак — імунатэрапія.

**Загадчык кафедры анкалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Аляксандр ЖУКАВЕЦ:**

— Наша кафедра забяспечвае адукацыю тым, хто ўжо мае медыцынскую адукацыю і вырашыў звязаць сваё жыццё з такім кірункам, як анкалогія. Тут ёсць тры асноўныя спецыялізацыі — прамянёвая тэрапія, анкахірургія і хіміятэрапія. Ёсць, акрамя гэтага, курсы ўдасканалення кваліфікацыі для дзеючых анколагаў. Навучанне такога кшталту неабходна, бо не кожны ўрач можа сам разабрацца ў той велізарнай колькасці інфармацыі, якая з'яўляецца сёння па гэтай тэме. Уся неабходная інфармацыя сканцэнтравана, вядома, у нацыянальных пратаколах дыягностыкі і лячэння пацыентаў, але ўрач павінен усё рабіць свядома, а не проста паўтараць алгарытм дзеянняў. Лячэнне хоць і адбываецца па стандартах, але яно ўсё роўна заўсёды індывідуальнае. Задача кафедры — растлумачыць, якія методыкі ёсць, што і калі трэба выкарыстоўваць. Акрамя таго, у навучанне ўведзены спецыяльныя цыклы па скрынінгу, ранняй дыягностыцы злаякасных новаўтварэнняў, большая частка слухачоў на якіх — не анколагі, а ўрачы іншых спецыяльнасцяў. Кафедра прымае ўдзел і ў навуковых распрацоўках па органазахавальнай методыцы ў пацыентаў з раннім ракам малочнай залозы і методыцы прамянёвай тэрапіі ў пацыентаў са злаякаснымі новаўтварэннямі скуры. 13 чалавек праходзяць у нас зараз клінічную ардынатуру.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

■ Рэха

Першай сусветнай

# БЕЛАРУСЬ — СТО ГАДОЎ ТАМУ

## Здзейсніць вандроўку ў мінулае прапануе калекцыянер Уладзімір БАГДАНАЎ

**Яго персанальная выстаўка «Мастакі на вайне. Беларусь у малюнках Першай сусветнай (1915—1918)», якая экспануецца ў Нацыянальным гістарычным музеі, — пра тое, як выглядала наша краіна ў адзін з найтрагічнейшых перыядаў сваёй гісторыі. Толькі на малюнках, зробленых нямецкімі мастакамі ў гады Першай сусветнай, баявых дзеянняў не ўбачыш. На паштоўках, арыгінальных эскізах і мініяцюрах — замкі, храмы, пейзажы, побытавыя эпізоды з жыцця нашых продкаў.**

Але, як прызнаецца аўтар праекта, гэта, хутчэй, выключэнне. Для мастакоў, якія не па волі лёсу апынуліся на чужыне, існавалі прадпісанні па мастацкім адлюстраванні вайны. У абавязковым парадку яны павінны былі візуалізаваць падзеі, што адбываюцца на фронце: не менш за эцюд на тыдзень, штомесяц — мінімум карціна.


**У сялянскай хаце. Дзятлаўскі раён, 1916 г.**

— Аднак рэчаіснасць брала сваё, — расказвае Уладзімір Багданаў. — На тэрыторыі Беларусі лінія фронту стабілізавалася на два з паловай гады, абстаноўка абвастралася толькі падчас буйных аперацый. Прафесійныя мастакі ўсё часцей адхіляліся ад мэт выяўленчай прапаганды і звярталі ўвагу на тое, што было вакол іх.

Часам замест вінтовак бралі ў рукі алоўкі і тыя, хто непасрэдна ўдзельнічаў у баявых дзеяннях. Прыехаўшы ваяваць, нямецкія афіцэры і салдаты трапілі ў не зусім звычайныя для іх умовы. Убачаным яны хацелі падзяліцца з роднымі: малявалі і адпраўлялі на радзіму не толькі віды з акопаў ды эпізоды атак, спрабавалі адлюстраваць мясцовую прыроду, тое, як жывуць і чым займаюцца беларусы.

— Напрыклад, дасылалі дамоў паштоўкі з зімнім пейзажам, гэтым самым расказваючы пра 35-градусны мароз, — гаворыць калекцыянер. — Адлюстраваннем packазаваеннай рэчаіснасці яны хацелі паказаць родным, што не ўсё так і дрэнна, спрабавалі іх супакоіць. Маўляў, глядзіце, мы жывём у вёсцы, у доме, заселеным трыма пакаленнямі сям'і, разам з намі сабака, куры — такая архаіка Еўропе была невядома. Не выпадкова паштоўкі з відамі Беларусі друкаваліся ў Берліне, Дрэздэне, Кёльне.

І не таму, што яны былі створаны вядомымі ў Германіі людзьмі. Немцам было цікава, як жывуць дзесьці яшчэ. З калекцыі Уладзіміра Багданава, напрыклад, толькі некалькі работ належаць знакамітаму мастаку. Герман Штрук, які, па ўсім відаць, захапляўся краявідамі Гродзеншчыны, у 1923 годзе даваў урокі графікі Марку Шагалу. А Фрыц Маўрышат, паштоўка якога таксама змяшчаецца ў экспазіцыі, за найлепшую работу мастака-пастаноўшчыка ў 1954 годзе атрымаў кінематаграфічны «Оскар». Астатнія ж аўтары вядомыя вузкаму колу людзей. Некаторыя ж з іх увогуле безыменныя — у памяць пра сябе яны пакінулі неразборлівыя аўтографы або ўвогуле палічылі непатрэбным падпісаць мастацкі твор.

Але, хутчэй, гэты нюанс прынцыповы для культурнай спадчыны немцаў. Нам жа цікава ўбачыць Беларусь стагадовай даўніны. Выстаўка, на якой прадстаўлена больш як 200 работ, быццам дыван-самалёт, пераносіць у мінулае. Дзякуючы малюнкам можна не проста па-новаму паглядзець на многія беларускія гарады, вясковае жыццё, а і ўбачыць страчаныя назаўсёды храмы, будынкі, цэлыя паселішчы.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

**Фота з калекцыі Уладзіміра БАГДАНАВА**

# А ХТО ТАМ ПРЫЙШОЎ?

## Адразу некалькі тэлеканалаў прадставілі гледачам новых вядучых

**Калі тэлевізар уключаеш рэгулярна, а не час ад часу, то да вядучых папулярных праграм прызвычайваешся, нібы да суседзяў ці нават прыяцеляў. Але рана ці позна ў адзін цудоўны момант замест знаёмых твараў бачыш на экране іншых асоб — і заканамерна цікавішся: куды зніклі старыя ўлюбёнцы і чаго чакаць ад новых людзей? «Звязда» разведала, хто гэтым летам знік з тэлевізійнага эфіру, а хто толькі прыйшоў або вярнуўся.**

### Дзяжурныя па краіне

Новага вядучага штотыднёвай інфармацыйна-аналітычнай праграмы «Галоўны эфір» Белтэлерадыёкампанія прадставіла гледачам загадзя. Дакладней, папярэдзіла, што ў кадр прыйдзе хтосьці добра знаёмы нам па тэле- і радыёпраектах, аднак да апошняга моманту трымала імя ў сакрэце.



І сапраўды, **Максім УГЛЯНІЦА,** які змяніў на інфармацыйна-тэлевізійным дзяжурстве па галоўных падзеях тыдня Дзмітрыя Бачкова, — не навічок у эфіры. Праўда, перадусім у радыйным. З 2003 года Максім працаваў на Першым нацыянальным канале Беларускага радыё — спачатку рэдактарам, каментатарам аддзела палітычных праграм, потым намеснікам дырэктара дырэкцыі інфармацыйнага і грамадска-палітычнага вяшчання, а са студзеня бягучага года стаў кіраўніком гэтай дырэкцыі. Цікавімся, ці лёгка даўся пераход з дырэктарскай пасады да «палявой» работы вядучага, і са студыі радыё — у тэлевізійную?

— Насамрэч дырэктарскае крэсла за мной захаваецца, бо ў «Галоўным эфіры» я задзейнічаны, так бы мовіць, у вольны ад асноўнай работы час, — зазначае Максім. — Дый досведу тэлевізійнай дзейнасці хапае: з 2001 года, яшчэ студэнтам журфака, я працаваў у АТН, а апошнія гадоў 6—7 перыядычна вёў праграмы на міжнародным тэлеканале «Беларусь 24». Так што работа ў «Галоўным эфіры» для мяне не стала чымсьці абсалютна новым: і да камеры не трэба прывыкаць, і прыкладную схему ўяўляю. Але гэта, безумоўна, зусім іншы ўзровень адказнасці, і многім тонкасцям я дагэтуль вучуся і, пэўна, яшчэ доўга буду вучыцца. Балазе, калегі дапамагаюць, падказваюць некаторыя рэчы, і ў дуэце з Палінай Шубай працаваць надзіва камфортна.

Свой першы «Галоўны эфір», прызнаецца Максім, ён прыхільнікам не глядзеў адразу — толькі праз некалькі дзён «на паскоранай перамотцы», каб зразумець, што трэба ўдасканальваць і куды рухацца ў першую чаргу.

Такім чынам, у праграме цяпер тры пары вядучых: Вікторыя Сянкевіч і Іван Міхайлаў, Максім Угляніца і Паліна Шуба, Сяргей Гусачэнка і Юлія Пярцова.



Яшчэ адзін новы твар — у выпускаў навін «Беларусь 1». Ужо некалькі тыдняў працуе ў дзённым прамым эфіры карэспандэнт Агенцтва тэленавін **Таццяна КАРОЛЬ,** вядомая гледачам па суботняй праграме «Невынікі». Дзяўчына — выпускніца Універсітэта культуры і мастацтваў па спецыяльнасці «культуралогія», скончыла курсы тэлевядучых у Белтэлерадыёкампаніі і прайшла кастынг вядучых. Але, прызнаецца, без журналісцкай адукацыі не адразу разумееш тэлевізійную кухню.

— Першыя выпускі я была нацэлена проста на тое, каб добра адчытаць тэкст з суфлёра. Усведамленне таго, што працуеш у прамым эфіры і цябе бачыць даволі вялікая аўдыторыя, «накрывае» не адразу, — гаворыць Таццяна. — Казусы дагэтуль здараюцца: то некаторыя навіны прыходзяць літаральна за пяць хвілін да эфіру і не паспяваеш іх нават прабегчы вачыма, то трэба рэзка пераключыцца на іншую камеру, то з суфлёрам не ўсё атрымліваецца... Мне важна быць не проста прыгожай карцінкай, «гаворачай галавой», таму стараюся зрабіць усё, каб мае словы разумелі. За тры тыдні цяжка пакуль што ацаніць уласную работу, але адмоўных водгукаў я не чула, а вось станоўчыя былі, нават ад калег з іншых тэлеканалаў. І самая галоўная выснова, што я для сябе зрабіла: мне вельмі падабаецца весці навіны!

### Старыя новыя знаёмыя

Перамены адбыліся і на тэлеканале АНТ. Напрыклад, цяпер штотыдня ў «Нашай раніцы» ў дуэце з Люцыяй Грашчанкай гледачоў будзіць спявак і тэлевядучы **Георгій КАЛДУН,** па якім многія прыхільніцы засумавалі пасля сыходу з эфіру інтэлектуальных шоу «Адзін супраць усіх» і «100 мільёнаў». І хоць раншні эфір — зусім не тое, што размоўна-забаўляльны жанр тэлегульні, фірменны гумар і імправізацыю Георгій стараецца выкарыстоўваць і тут.



Зрэшты, папярэджвае прэс-сакратар АНТ Святлана Ціханава, гаварыць пра тое, што Георгій Калдун замяніў у эфіры Валерыя Кашчэева, ні ў якім разе нельга: «Валерыя ніхто не заменіць — ды ён і не сыходзіць з АНТ, на гэты момант рыхтуе асабістую рубрыку, прысвечаную архітэктуры (па першай адукацыі, атрыманай у Беларускім політэхнічным інстытуце, Валерый менавіта архітэктар. — **Аўт.**). Плануецца, што выходзіць рубрыка будзе штотыдзень, а ўбачаць яе гледачы зусім хутка, у новым сезоне».

Не варта непакоіцца і прыхільнікам абаяльнай **Марыны ГРЫЦУК.** У тэлевядучай была важкая і прыемная прычына, каб зрабіць перапынак у працы, — нараджэнне чацвёртага дзіцяці. І хоць яе малодшаму сыну Марку ўсяго два месяцы, Марына не выпала з эфіру: 3 ліпеня разам з калегамі яна вяла тэматычны эфір, прысвечаны Дню Незалежнасці, а ўжо ў сярэдзіне ліпеня вернецца і ў студыю «Нашай раніцы».



— Мне здавалася, я гэтак ціхенька адыду з праграмы, а потым вярнуся, і ніхто нічога не заўважыць, — смяецца Марына ў адказ на пытанне, як яна ўсё паспявае. — Насамрэч паспяваю далёка не ўсё, але ў мяне шмат памочнікаў, і малы спакойны, дый работа, шчыра кажучы, не з дзевяці да шасці штодня, а некалькі гадзін у месяц — чаму ж не вярнуцца да яе, калі ўсё складваецца. Так што, думаю, вярнуся ў эфір уся такая пазітыўная, напоўненая новымі эмоцыямі, натхнёная, і будзем усе разам сачыць за тым, як мая ўсмешка змянілася ў шырыню...

***— Можа, за гэты час выспее і аўтарскі «бацькоўскі» праект?***

— Маеце на ўвазе «Бацькоў у школу» або такі праект, куды можна прыйсці з немаўлём і на яго прыкладзе штосьці паказваць і расказваць? Насамрэч наўрад ці я сёння да гэтага гатовая — вось калі чалавечак падрасце і канал штосьці прапануе, можна будзе падумаць.

А неўзабаве ў шэрагах вядучых АНТ могуць з'явіцца і зусім новыя твары. Прынамсі, ахвотнікаў хапае. На кастынг вядучых і карэспандэнтаў, які тэлеканал абвясціў гэтым летам, прыйшло ўжо звыш 800 заявак!

### Двое з рублямі

Тэлеканал «Беларусь 2» да новага сезона вырашыў змяніць вядучых папулярнага праекта — інтэрактыўнай экс-прэс-віктарыны «Два рублі». На змену блізнятам Рустаму і Равілю Насыравым, якія проста на вуліцы задавалі выпадковым мінакам пытанні з гісторыі Беларусі, культуры, навукі, спорту і яшчэ дзясятак розных сфер, прыйдуць артысты Маладзёжнага тэатра эстрады, браты Андрэй і Дзмітрый Дубешкі. Альбо спявачкі і тэлевядучыя Аляксандра і Валянціна Груздзевы. Альбо спявачка і педагог Лера Зверава ў тандэме з вядучым праграмы «Пін_код» Аляксандрам Мамошкам.




Хто менавіта будзе выконваць абавязкі людзей шчодрай душы, вырашаць самі тэлегледачы, якія з 31 ліпеня і да канца лета змогуць галасаваць за ўпадабаную пару вядучых на афіцыйнай старонцы праграмы ў сацыяльнай сетцы «УКантакце». Першы дуэт кандыдатаў — Андрэй і Дзмітрый Дубешкі — выйдзе на вуліцы сталіцы на інтэлектуальнае «паляванне» ўжо ў наступную нядзелю, 16 ліпеня. Умовы гульні засталіся ранейшымі: правільны адказ на нечаканае пытанне прыносіць дробны, але прыемны сюрпрыз — двухрублёвую манету, няправільны — пажаданне добрага дня і ўдачы.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.** *tselyashuk@zviazda.by*

---

■ Тэлесеткі

# САЛІСТ, ДУЭТ АБО КВАРТЭТ?

## Журы вызначыла фіналістаў нацыянальнага адбору на «Дзіцячае Еўрабачанне—2017»

**...Некалькі гадзін доўжылася жывое праслухоўванне ў «студыі 600» Белтэлерадыёкампаніі. Сярод прэтэндэнтаў на ўдзел у міжнародным дзіцячым песенным конкурсе сёлета аказалася 37 сольных выканаўцаў і 8 вакальных гуртоў, і кожнаму з іх журы на чале з народным артыстам Беларусі, кампазітарам Эдуардам Зарыцкім дало шанц быць пачутым і ўбачаным.**

Але пашанцавала ў выніку толькі 10 кандыдатам — дакладней, васьмі сольным выканаўцам ва ўзросце 9—14 гадоў, аднаму дуэту і аднаму квартэту. Па выніках праслухоўвання зялёнае святло ў фінал загарэлася для прадстаўніцы Мінска Русланы Панчышынай, Хелены Мераакі, Стэфаніі Сакаловай, Анастасіі Жабко, Марыі Жылінай, Эліны Матарас і Яраслава Сакалікава, а таксама для брастаўчанкі Анастасіі Цімафеевіч, дзявочага дуэта Арыны Пехцеравай і Анастасіі Дзмітрачковай з Магілёва і вакальнага квартэта Нацыянальнага цэнтра дзіцячай творчасці імя У. Мулявіна: Максіма Цупрыкава, Ангеліны Ламака, Стэфаніі Круглай і Стэфаніі Сакаловай.



Як расказалі «Звяздзе» ў медыяхолдынгу, 21 ліпеня пройдзе жараб'ёўка канкурсантаў, якая вызначыць парадак выступленняў у фінале. Дарэчы, упершыню за ўвесь час у фінале двойчы выступіць адзін і той жа юны артыст: настолькі перакanaўчай была і сольна, і ў складзе вакальнага гурта мінчанка Стэфанія Сакалова, ужо добра вядомая гледачам па тэлепраектах «Я спяваю» і «Голас. Дзеці». Але дастанецца музычная пуцёўка на «Дзіцячае Еўрабачанне—2017» у Грузіі Стэфаніі або камусьці з яе калег-саапернікаў, вырашаць суддзям і тэлегледачам. Фінальны гала-канцэрт беларускага нацыянальнага адбору запланавана правесці яшчэ да пачатку навучальнага года, 25 жніўня.




**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
*tselyashuk@zviazda.by*

## Серада, 19 ліпеня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.50** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 0.15** Зона Х. (16+).
**9.10, 10.05, 15.25, 16.05** «Выратуйце нашу сям'ю». (16+).
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00** Дзіцячы доктар. (6+).
**11.35, 12.10, 19.55 Серыял «Лесвіца ў нябёсы». (12+).**
**13.05 Серыял «Жанчына ў бядзе-3». (16+).**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**17.30 Серыял «Вой, ма-мачкі!» (12+).**
**19.20, 0.35** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.00** «Славянскі базар у Віцебску-2017». Канцэрт Зары ў суправаджэнні Прэзідэнцкага аркестра РБ пад кіраваннем В. Бабарыкіна.
**1.10** Дзень спорту.
**1.25 Серыял «Вышук». (16+).**

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца. (12+).
**9.00, 22.10** Тэлебарометр.
**9.05, 19.35 Меладрама «Жамчужына палаца». (12+).**
**10.15** «Пра ежу». (12+).
**10.50, 16.40 Серыял «Апошні з Магікян». (16+).**
**12.00, 22.15** «Бітва экстрасэнсаў. 12-ы сезон». (16+).
**14.05, 20.50** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу. (16+).
**15.20** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.10** «Багіня шопінгу». (16+).
**17.55** «Тата папаў». Сямейнае рэаліці-шоу. (16+).
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**0.20** «Анлайн 2.0». Скетчкам. (16+).

### Беларусь 3

**7.00** «Я хачу гэта ўбачыць!» Браслаўскі раён. 2-я частка (6+).
**7.25, 12.50** «Беларуская кухня». Кнэдлікі.
**7.55, 12.00, 18.40** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.10, 12.15, 18.55, 22.50** «Гэты дзень».
**8.15, 13.40 «Пацалунак Сакрата». Дэтэктыў. Фільм першы «Смяротны водар». 2-я серыя (16+).**
**9.10, 14.30 «Востраў скарбаў». Маст. фільм. 1-я серыя (6+).**
**10.15** «Камертон». Народны артыст СССР Валянцін Елізар'еў.
**10.45, 15.40 «На ўсё астатнае жыццё». Драма (12+).**
**12.20** «Наперад у мінулае».
**13.15** «Святло далёкай зоркі». Памяці аператара, рэжысёра, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Сяргея Пятроўскага.
**16.50, 21.05** «Вызваленне» (12+).
**17.15, 21.30 «Ішоў чацвёрты год вайны...» Маст. фільм (12+).**
**19.00** «Славянскі базар—2017». Канцэрт «Вітае Украіна».
**20.40** «Калыханка» (0+).

### Беларусь 5

**8.00, 11.00, 16.30, 18.50** Водныя віды спорту. Чэмпіянат свету.
**9.05** Футбол. Кубак чэмпіёнаў. «Мілан» (Італія) — «Барусія Дортмунд» (Германія).
**13.35** Спорт-кадр.
**14.10, 23.15** Футбол. Кубак чэмпіёнаў. «Баварыя» (Германія) — «Арсенал» (Англія).
**16.10** Козел пра футбол.
**17.55** Час футбола.
**18.40, 23.05** Спорт-цэнтр.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 7.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!» (12+).
**10.20** «Смак» (12+).
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор» (12+).
**12.10, 23.40** «Сам-насам з усімі». (16+).
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**14.15, 16.20** «Час пакажа» (16+).
**16.55** «Давай пажэнімся!» (16+).
**18.20** «Кантрольная закупка» (12+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**19.00** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Чырвоныя горы» (16+).**
**22.45 Серыял «Лонданград» (16+).**
**0.30** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**7.40, 20.10. 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.05** «Тайны Чапман» (16+).
**9.20** «Далёкія сваякі» (16+).
**9.35, 17.35** «Званая вячэра» (16+).
**10.40, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**11.30, 22.00** «Глядзець усім!» (16+).
**11.50, 23.55 «Баец. Нараджэнне легенды». Серыял (16+).**
**13.50** «Тэрыторыя памылак» (16+).
**15.35** «Вадзіць па-руску» (16+).
**16.05** «Аўтапанарама» (12+).
**16.50 «Салдаты і афіцэры». Серыял (16+).**
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Сакрэтныя тэрыторыі» (16+).
**1.30** «Сильные мира сего». (16+).

### МІР

**10.00** М/ф «Маша і Мядзведзь» (0+).
**10.10 «Любімыя акцёры 2.0». Фільм «У бой ідуць адны «старыя» (12+).**
**10.45, 13.15 Серыял «Смерць шпіёнам!» (16+).**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**15.00** Дак. фільм «Сямейныя драмы» (16+).
**16.15 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
**19.20 Серыял «АСА» (16+).**
**23.10 Маст. фільм «Чужы ў доме» (12+).**
**1.00 Маст. фільм «Выпрабавальны тэрмін» (16+).**
**2.45 Серыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу» (12+).**
**4.55** М/ф (0+).

### РТР—Беларусь

**7.00** «Залатая калекцыя беларускай песні» ў Бабруйску (12+).
**9.50** Урачыстая цырымонія закрыцця Міжнароднага фестывалю «Славянскі базар у Віцебску» (12+).
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**12.00** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.20** «Пакой смеху» (16+).
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
**15.40** «Прамы эфір» (16+).
**17.20 Серыял «Па гарачых слядах» (12+).**
**19.15, 20.40 Серыял «Тэрмінова ў нумар!» (16+).**
**22.00, 23.10 Серыял «Год у Таскане» (12+).**

### НТБ—Беларусь

**6.15** «Астрапрагноз».
**6.20** Кватэрнае пытанне (0+).
**7.15 Серыял «Вярнуць на даследаванне» (16+).**
**8.50, 23.05** «НЗ.by».
**9.10, 10.30 Серыял «Вяртанне Мухтара» (16+).**
**11.25 Серыял «Кодэкс гонару» (16+).**
**13.25, 18.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «Павуцінне» (16+).**
**16.30 Серыял «Сведкі» (16+).**
**19.40 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).**
**23.25 Серыял «Дазнаўца» (16+).**

### 8 канал

**7.00, 15.55, 19.20, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05** «Мультпарад». «Кошчын дом».
**7.35 Серыял «Выратаваць боса».**
**8.25 Драма «Мой ласкавы і пяшчотны звер».**
**10.15** «Сябры дзядулі Марка».
**10.30** «Адшукваецца адпачынак».
**11.00 Камедыя «Нявеста і забабоны».**
**12.50, 19.25 Серыял «Палацавыя тайны».**
**14.15 Фантастыка «Вайна светаў».**
**16.00** «Мультпарад».
**16.25 Драма «Табар ідзе ў неба».**
**18.05 Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».**
**18.50** «Мой любімы гадаванец».
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Камедыя «Місіс Даўтфайр».**
**23.10 Серыял «Сіндбад».**

### ВТБ

**6.00, 14.10** Серыял «Варонiны». (12+).
**8.00** «Ералаш». (6+)
**8.30, 4.20** М/ф «Тры каты». (0+)
**8.50, 4.40** М/ф «Фіксікі». (0+)
**9.10, 5.00** М/ф «Маша і Мядзведзь». (0+)
**9.30, 19.00** Серыял «Дах свету-2». (16+).
**10.30** Камедыя «Без ансамбля». (16+).
**12.10** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).
**12.40, 0.00** «Дурні і дарогі». (16+).
**13.10, 20.00** Серыял «Мамачкі». (16+).
**16.20** Серыял «Закрытая школа-4». (16+).
**17.20, 3.50** Серыял «Гэта каханне». (16+).
**17.50, 22.45** «Уральскія пельмені». (16+).
**21.00** Камедыя «Шары лютасці». (12+).
**0.30** Серыял «Бязмоўны сведка». (16+).
**1.50, 5.10** Серыял «Метад Лаўровай». (16+).
**2.40** «Лаві момант». (16+).
**3.00** «Не можа быць!» (16+).

### Культура

**10.00, 15.00, 19.30, 23.20** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15, 22.00** «Каломба». Серыял.
**12.45** «Геній рускага мадэрну. Фёдар Шэхтэль». Дак. фільм.
**13.25, 18.45** «Раманавы. Асабістыя хронікі стагоддзя». Дак. серыял.
**13.50** Да 95-годдзя Маскоўскай філармоніі. Дзмітрый Кітаенка і Акадэмічны сімфанічны аркестр Маскоўскай дзяржаўнай філармоніі. Запіс 1978 года.
**14.50** «Наваі». Дак. фільм.
**15.10** «Падарожжы натураліста».
**15.35, 20.25** «Ключ да разгадкі старажытных скарбаў». Дак. серыял.
**16.30** «Правінцыйныя музеі Расіі». Юр'еў-Польскі (Уладзімірская вобласць).
**16.55, 0.05** «Вечны кліч». Серыял.
**18.05** «Больш, чым каханне». Чарльз Дыкенс і Кэтрын Хогарт.
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** «Абсалютны слых».
**21.20** «Вышыня. Норман Фостэр». Дак. фільм.
**23.10** «Сірано дэ Бержэрак». Дак. фільм.
**23.35** «Заўтра не памрэ ніколі». Дак. серыял.
**1.15** «Больш, чым каханне». Эдгар Алан По і Вірджынія Клем.

### Настальгія

**6.00** Маст. фільм «Шафёр на адзін рэйс». (16+).
**8.15, 9.40, 14.20, 15.40, 17.10, 19.05, 20.25, 21.40, 3.00, 5.45** Музычная настальгія (12+).
**9.00, 15.00, 21.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР». (12+).
**11.00** «Песня-77» (12+).
**12.00** Маст. фільм «Амаль смешная гісторыя». (16+).
**17.35** Маст. фільм «Страказіныя крылы». (16+).
**18.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Гісторыя Алімпіяды-80». 2005 год (12+).
**19.30** Фільм-спектакль «Аграбленне апоўначы». 1978 год (16+).
**23.00** «КВЗ-87—88». Каманды НДУ і 1-га ЛМІ. 1-я частка (12+).
**0.00** «Акулы пяра». Юрый Грымаў. 1997 год (16+).
**0.50** «Рок-н-рол ТБ». 1992 год (16+).
**1.35** Праграма «Тэма» з Уладзіславам Лісцьевым: «Прыватная ўласнасць (Прыватызацыя)». 1992 год (16+).
**2.20** Праграма «Стыль». 1992 год (16+).
**3.15** Маст. фільм «Арбацкі матыў». (16+).

### EuroSport 1

**4.00, 7.00, 11.00, 18.45, 21.30** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны.
**5.30, 9.30, 13.15, 21.00, 23.50, 2.30** Веласпорт. «Тур дэ Франс».
**9.25** Зімовыя віды спорту. «У пагоні за гісторыяй».
**10.55** «Гісторыі спартсменаў».
**12.00** Веласпорт. «Тур дэ Франс» з Грэгам Лемондам.
**13.00, 18.30** Веласпорт. «Тур дэ Франс»-экстра.
**1.00** Аўтагонкі. World Endurance.
**1.30** Аўтагонкі. Формула Е.

### Кінакамедыя

**0.35** Камедыя «М + Ж». (16+).
**2.00** — прафілактыка на тэлеканале.
**11.00** Камедыя «Высокі бландын у чорным чаравіку». (12+).
**12.35** Камедыя «Вяртанне высокага бландына». (12+).
**14.00, 14.50, 15.40** Скетчкам «Паміж намі». (16+).
**14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)» (16+).
**16.00** Меладрама «Адчыніце, Дзед Мароз». (12+).
**17.50** Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе-2». (16+).
**19.30** Камедыя «Вяселлі і іншыя непрыемнасці». (16+).
**21.15** Драма «Па версіі Барні». (16+).
**23.35** Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе-3». (16+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**7.30** «Шафа» (16+).
**8.20** «Доктар І...» (16+).
**8.50, 19.00, 3.10** «Падарунак лёсу». Серыял (16+).
**10.30** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**12.10** «Сляпая» (12+).
**13.10** «Варажбітка» (12+).
**14.15, 4.45** «Паралельны свет» (12+).
**15.10** «Трэндзі» (16+).
**15.40** «Здзелка» (16+).
**16.05** «Натуральны адбор» (12+).
**17.10** «Шчыра» (12+).
**18.05** «Самара». Серыял (16+).
**20.55** «Магазіна» (16+).
**21.55** «Рэвізора» (16+).
**23.00, 5.35** «Лінія абароны» (16+).
**23.30** «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
**0.15** «Гульня». Трылер (16+).
**2.20** «Жанна, пажані» (16+).

### TV 1000 ТБ1000

**6.10** Там, дзе сэрца (16+).
**8.30** Прыстанак праклятых (16+).
**10.45** Абуджэнне (12+).
**13.15** Дварэцкі (16+).
**15.50** Помні (Мемента) (18+).
**18.10** Ужо хто б казаў-3 (12+).
**20.10** Пенелопа (12+).
**22.10** Настаўнік на замену (16+).
**0.10** Па-за часам (16+).
**2.10** Імгла (16+).
**4.15** Ён, я і яго сябры (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Няўлоўныя: Бангкок (16+).
**8.10** Гуляй, Вася! (16+).
**10.10** Шпіён (16+).
**12.20** Мая марачка (12+).
**14.05** Уладары сноў (16+).
**15.45** Ваўкадаў (16+).
**18.30** Прыстойныя людзі (16+).
**20.20** Мусульманін (16+).
**22.30** Іншае кіно. Пеця па дарозе ў Царства Нябеснае (16+).
**0.30** Ржэўскі супраць Напалеона (16+).
**2.10** Кахае не кахае (16+).
**4.05** Вайна (18+).

### National Geographic

**6.00** Займальная навука. (12+).
**6.50, 14.10, 5.35** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**8.05, 10.20, 14.55** Мегазаводы. (12+).
**8.50, 11.05, 15.40, 19.30, 0.05, 2.20** Міжнародны аэрапорт Дубай. (12+).
**9.35, 13.25** Гульні розуму. (12+).
**12.40, 18.45, 21.45, 1.35, 4.45** Космас: прастора і час. (12+).
**18.00, 21.00, 0.50, 3.55** Дзікі тунец. (12+).
**20.15** Аўта-SOS. (12+).
**22.30** Ліхтугі за мяжой. (16+).
**23.15, 3.10** Секунды да катастрофы. (16+).

### Discovery

**8.00, 14.00, 0.00, 3.50** Зорнае выжыванне. (16+).
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена? (12+).
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена? (12+).
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Паляўнічыя на рэліквіі. (12+).
**10.30, 16.30, 19.00, 23.30, 2.00, 7.35** Паляўнічыя на склады. (16+).
**11.00** Металаломшчыкі. (12+).
**17.00, 22.00, 6.20** Махінатары. (12+).
**18.00, 1.00** Сіднэйская бухта. (16+).
**20.00** Скарб Купера. (12+).
**2.55** Як працуюць машыны. (12+).
**4.40** Маланкавыя катастрофы. (16+).

## Усходні гараскоп на



**АВЕН.** У панядзелак не ідзіце супраць натоўпу ў маральным плане або ў самым што ні на ёсць прамым сэнсе — апынуўшыся ў шматлюдным месцы, не ідзіце супраць патоку людзей. У сераду вашы ідэі будуць залішне арыгінальныя. Не спяшайцеся ўвасабляць іх у жыццё. Будзьце абачлівыя ў зносінах. На дарозе ўлічвайце, што ў гэты дзень павышаная рызыка ДТЗ. Пачуццё свабоды і выдатны настрой падарыць вам пятніца. У нядзелю абвострыцца канфлікт паміж работай і домам, напрыклад, вы зразумееце, што работа адымае занадта шмат часу ад сям'і, а калі вы ў нядзелю працуеце, то на працы адбудзецца нешта важнае, што запатрабуе ад вас поўнай самааддачы.



**ЦЯЛЕЦ.** Шмат часу давядзецца ўдзяліць зносінам з блізкім акружэннем: раднёй, суседзямі, знаёмымі, якіх вы бачыце пастаянна. У панядзелак і аўторак варта заняцца сваёй знешнасцю. Ад чацвярга да суботы будзеце энергічна зарабляць ці не менш энергічна распускаць грошы, а калі ў вас рукі растуць адтуль, адкуль трэба, з галавой сыдзеце ў рукадзелле або нейкае рамесніцтва.



**БЛІЗНЯТЫ.** У панядзелак і аўторак будзеце загружаныя дробнымі справамі і абавязкамі. Вольнага часу застанецца няшмат. У сераду будуць нечаканыя навіны ці сустрэча. Павышаецца рызыка ДТЗ і праблем з электроннымі устройствамі. Ад чацвярга да суботы будзеце энергічна прыводзіць у парадак знешнасць. Гэта зручны час не толькі для пакупкі ўбораў і візіту ў цырульню, але і для наведвання стаматолага, выдалення радзімак і бародавак. Падзеі ў фінансавай сферы будуць актыўна развівацца ўвесь тыдзень.



**РАК.** Самаразвіццё, справы, у якіх вы вельмі зацікаўлены, і самастойнасць — вось кола вашых інтарэсаў на гэтым тыдні. Вы будзеце энергічна ісці да сваёй мэты, часам нават рассоўваючы локцямі навакольных. На гэтым шляху не выключаны сур'ёзны канфлікт з навакольнымі і разрыў утомных і бескарысных сувязяў. У панядзелак старайцеся не аказвацца ў натоўпе. У сераду і чацвер менш давярайце агульнапрынятым правілам і больш — інтуіцыі. Кантактуйце не з тымі, хто мае чыны і высокі статус у грамадстве, а з духоўна развітымі людзьмі.



**ЛЕЎ.** Давядзецца разбірацца з нейкімі загадкамі: можа, самі будзеце рабіць большую частку важных спраў употай ад навакольных, а можа, будзеце разгадваць чужыя таямніцы і выводзіць на чыстую ваду інтрыганаў і таемных ворагаў. Рэкамендуецца больш адпачываць, інакш з-за перанапружання рызыкуеце апынуцца ў бальніцы. Умераныя фізічныя нагрузкі, расслабляльны адпачынак для зняцця стрэсу ў аўторак, абавязковыя прагулкі на свежым паветры з чацвярга па суботу — і вам не прыйдзецца турбавацца пра здароўе.



**ДЗЕВА.** Вы будзеце вельмі шмат займацца групавымі справамі. У выніку паўстане пытанне, як сумясціць іх з асабістым жыццём і ўласнымі творчымі праектамі, ды і з планамі на адпачынак таксама. Хутчэй за ўсё, вы ахвяруеце асабістымі інтарэсамі дзеля інтарэсаў групы, сцяміўшы, што разам з аднадумцамі даможацеся большага. Не будуйце планаў на сераду — умяшаюцца абставіны, і вы будзеце занятыя не тым, што планавалі. Прыемныя зносіны і адпачынак чакаюць з чацвярга па суботу.

# ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск №22

Сёлета спаўняецца сто гадоў з дня нараджэння брэсцкага шахматнага кампазітара Герасіма Вышынскага (1917—1992). Герасім Клімавіч нарадзіўся ў шматдзетнай сялянскай сям'і на Кобрыншчыне. Ваяваў, узнагароджаны медалямі. Працаваў інжынерам-будаўнікам у Брэсце. Быў адным з актыўных арганізатараў шахматнага жыцця ў Брэсцкай вобласці. Пачынаючы з 1950-х гадоў, склаў больш за 60 задач, частка з іх была адзначана ў конкурсах. Перавагу аддаваў задачам на мат у 2 і 3 хады. Двухходоўка Г. Вышынскага, якую прапануем увазе чытачоў, атрымала пахвальны водгук у тэматычным конкурсе газеты «Звязда» ў 1985 годзе ***(гл. дыяграму)***.




**Белыя:** Kph5, Лc1, Cd4, Cg8, Kf2, пп. e3, g2 (7).

**Чорныя:** Kpf5, Kb7, пп. d5, h4 (4).

Мат у 2 хады.

Дасылайце рашэнні на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru.

* * *

У Ханты-Мансійску прайшлі камандныя чэмпіянаты свету сярод мужчын (1. Кітай; 2. Расія; 3. Польшча) і жанчын (1. Расія; 2. Кітай; 3. Грузія). Сярод дзесяці мужчынскіх камандаў выступала і зборная Беларусі, якая патрапіла ў турнір па рашэнні прэзідэнта ФІДЭ — у якасці «бонусу». Нашы гросмайстры выйгралі 3 матчы, прайгралі 4, звялі ўнічыю 2. У выніку — 6—8 месцы, а па дадатковых паказчыках — сёмае. Сяргей Жыгалка і Аляксей Фёдараў набралі па 4 ачкі з 8, Кірыл Ступак — 3,5 з 7, Уладзіслаў Кавалёў — 4,5 з 8, Аляксей Аляксандраў — 1,5 з 4. Прывядзём дзве пераможныя партыі беларускіх шахматыстаў.

Сяргей Жыгалка — Ар'ян Тары (Нарвегія). 1.e4 c6 2.d4 d5 3.e5 Cf5 4.Kf3 e6 5.Ce2 Ke7 6.c3 Kd7 7.0-0 h6 8.a4 a5 9.Ka3 g5 10.Ke1 Cg7 11.f4 gf 12.Kd3 Фb6 13.Kph1 Kg6 14.K:f4 K:f4 15.Л:f4 f6 16.Л:f5 ef 17.e6 Kf8 18.Cd3 K:e6 19.C:f5 Kg5 20.Фh5+ Kpf8 21.Cf4 Ф:b2 22.Cd6+ Kpg8 23.Лe1 Лf8 24.C:f8 Фf2 25.Фe8, 1:0.

Махеб Амейр (Егіпет) — Кірыл Ступак. 1.e4 e6 2.d4 d5 3.Kd2 Ce7 4.e5 c5 5.c3 Kc6 6.Cd3 Фb6 7.Kdf3 f6 8.Ke2 fe 9.de Cd7 10.0-0 0-0-0 11.b4 Фc7 12.Cf4 Лf8 13.bc C:c5 14.Cg3 Kge7 15.Ked4 a6 16.Лc1 Kpb8 17.Фe2 h6 18.K:c6+ K:c6 19.c4 Kb4 20.cd K:d5 21.Kd4 Фb6 22.Kf5 ef 23.e6+ f4 24.ed fg 25.hg Фd6 26.Kph1 Cd4 27.Лfd1 Ф:d7 28.C:a6 Л:f2 29.Фh5 Kf6 30.Фa5 Лf5, 0:1.

* * *

Мікіта Маёраў быў 12-м са 137 удзельнікаў на турніры ў Варонежы, Сяргей Каспараў — восьмым з 31 у Іспаніі. Андрэй Жыгалка падзяліў 1—3 месцы (па дадатковых паказчыках ён трэці) на турніры ў Ерэване (82 удзельнікі). На Мемарыяле Г. Верасава ў Мінску (83 удзельнікі) прызавую тройку склалі Наталля Кусянкова, Васіль Слабада і Валерый Смірноў.

* * *

Рашэнне задачы з мінулага выпуску: 1.Kc2! g3 2.Фe6+, 1...Kpe4 2.Фe3+, 1...c5 2.Фe6+, 1...Kpd5 2.Фf6. Уладзімір Ізотаў з Віцебска, які першым даслаў правільны адказ, у сваім лісце піша: «Хачу падзякаваць рэдакцыі за аднаўленне шахматнай рубрыкі. Асабліва радуе, што яна выходзіць рэгулярна, у вызначаныя дні. У 1975—90 гадах я неаднаразова ўдзельнічаў у конкурсах рашэнняў «Звязды». Потым давялося надоўга адкласці сваё захапленне. Цяпер рашаю задачы і эцюды найперш «для сябе» — гэта прыемны від адпачынку».

* * *

Віншуем з Міжнародным днём шахмат, які штогод адзначаецца 20 ліпеня, усіх аматараў старажытнай гульні!

**Вадзім ЖЫЛКО.**

## Пятніца, 21 ліпеня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.20** Зона Х. (16+).
**9.10 Меладрама «Завіруха». (12+).**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00** Дзіцячы доктар. (6+).
**11.35, 12.10, 20.00 Серыял «Лесвіца ў нябёсы». (12+).**
**13.05 Серыял «Жанчына ў бядзе-4». (16+).**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 16.05** «Выратуйце нашу сям'ю». (16+).
**17.30 Серыял «Вой, ма-мачкі!» (12+).**
**21.00** Панарама.
**21.45 Меладрама «Мама паняволі». (12+).**
**0.10** Дзень спорту.
**0.25 Серыял «Вышук». (16+).**

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца. (12+).
**9.00, 22.10** Тэлебарометр.
**9.05, 19.35 Меладрама «Жамчужына палаца». (12+).**
**10.15** «Пра ежу». (12+).
**10.50, 16.40 Серыял «Апошні з Магікян». (16+).**
**12.00, 22.15** «Бітва экстрасэнсаў. 12-ы сезон». (16+).
**14.05, 20.50** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу. (16+).
**15.20** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.10** «Багіня шопінгу». (16+).
**17.55** «Тата папаў». Сямейнае рэаліці-шоу. (16+).
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**0.20** «Анлайн 2.0». Скетчкам. (16+).

### Беларусь 3

**7.00** «Я хачу гэта ўбачыць!» Ліда (6+).
**7.25, 13.15** «Беларуская кухня». Квас з рыбай.
**7.55, 12.00, 18.40** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.10, 12.15, 18.55, 23.00** «Гэты дзень».
**8.15, 13.40 «Пацалунак Сакрата». Дэтэктыў. Фільм другі «Каралі Неферціці». 2-я серыя (16+).**
**9.05, 14.30 «Востраў скарбаў». Маст. фільм, заключная серыя (6+).**
**10.15** М/ф (0+).
**10.30** «Камертон». Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Іван Герасевіч.
**10.55, 15.35 «На ўсё астатняе жыццё». Драма, заключная серыя (12+).**
**12.20** «Сіла веры».
**12.45** «Наперад у мінулае».
**16.40, 21.05** «Вызваленне» (12+).
**17.10, 21.30 «Атака». Драма (12+).**
**19.00** «Славянскі базар— 2017». «Саюзная дзяржава запрашае...». Юбілейны канцэрт ансамбля «Сябры».
**20.40** «Калыханка» (0+).

### Беларусь 5

**8.00, 14.35** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 2-і кваліфікацыйны раўнд.
**9.50** Аўтаспорт. Формула-Е. Нью-Ёрк.
**11.00, 16.30** Водныя віды спорту. Чэмпіянат свету.
**14.15** Козел пра футбол.
**18.00** Куды сыходзяць чэмпіёны. Спецыяльны рэпартаж.
**18.20** Піт-стоп.
**18.50, 23.05** Спорт-цэнтр.
**19.00** Футбол. Кубак чэмпіёнаў. «Манчэстэр Юнайтэд» (Англія) — «Манчэстэр Сіці» (Англія).
**21.00** Лёгкая атлетыка. Брыльянтавая ліга. Манака.
**23.15** Сусветныя гульні — 2017. Вроцлаў. Відэачасопіс.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 7.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!» (12+).
**10.15** «Смак» (12+).
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор» (12+).
**12.10** «Сам-насам з усімі». (16+).
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**14.15** «Час пакажа» (16+).
**16.20 Маст. фільм «Байка» (12+).**
**18.20** «Кантрольная закупка» (12+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**19.00** «Поле цудаў» (16+).
**20.00** Час.
**21.05** «Пераможца» (12+).
**22.40 Дэтэктыў «Тэгеран-43» (12+).**
**1.20** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою»(6+).
**7.40, 20.10. 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.05** «Тайны Чапман» (16+).
**9.20** «Далёкія сваякі» (16+).
**9.35, 17.35** «Званая вячэра» (16+).
**10.40, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**11.30, 22.00** «Глядзець усім!» (16+).
**11.50, 23.50 «Баец. Нараджэнне легенды «. Серыял (16+).**
**13.50** «Дзіўная справа» (16+).
**15.35** «Вадзіць па-руску» (16+).
**16.05** «Аўтапанарама» (12+).
**16.50** «Скардзіцца дазваляецца».
**17.10** «Усім па катку» (16+).
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Застылая тайна планеты». (16+).
**1.30** «Засакрэчаныя спісы. Сем смяротных грахоў, якія правяць светам». (16+).

### МІР

**6.00** М/ф «Маша і Мядзведзь» (0+).
**6.45** «Мой найлепшы сябар» (12+).
**7.15** «Медыцынская праўда». Метэарызм (12+).
**7.45 Серыял «АСА» (16+).**
**10.45, 13.15, 4.30 Серыял «Пад Вялікай Мядзведзіцай» (16+).**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**15.00** Дак. фільм «Сямейныя драмы» (16+).
**16.15** «Сталінградская бітва: «Генерал-штурм», супраць фельдмаршала па мянушцы «Сатрап» (12+).
**17.10 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
**23.35 Маст. фільм «Той самы Мюнхгаўзен» (0+).**
**2.10** «Трымайся, шоубіз!» (16+).
**2.40** «Зорка ў падарунак» (12+).
**3.05 Маст. фільм «Банкаўскі квіток у мільён фунтаў стэрлінгаў» (16+).**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**12.00** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.20** «Пакой смеху» (16+).
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
**15.40** «Прамы эфір» (16+).
**17.20 Серыял «Па гарачых слядах» (12+).**
**19.15, 20.40 Серыял «Тэрмінова ў нумар!» (16+).**
**21.55, 23.10** «Гумарына» (16+).
**0.10** Юбілейны канцэрт Алега Газманава (12+).

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.05** «Судовы дэтэктыў» (16+).
**7.10** «Дзелавая раніца НТБ» (12+).
**8.05 Серыял «Вярнуць на даследаванне» (16+).**
**8.50, 23.05** «НЗ.by».
**9.10, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара» (16+).**
**11.20 Серыял «Кодэкс гонару» (16+).**
**13.25, 18.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «Павуцінне» (16+).**
**16.30 Серыял «Сведкі» (16+).**
**19.40, 23.30 Серыял «Марскія д'яблы. Лёсы» (16+).**

### 8 канал

**7.00, 15.55, 19.00, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05** М/ф.
**8.20 Серыял «Выратаваць боса».**
**9.10 Прыгоды «Зямля Саннікава».**
**10.45** «Сябры дзядулі Марка».
**11.00 Драма «Крамер супраць Крамера».**
**12.50, 19.05 Серыял «Палацавыя тайны».**
**14.10 Фантастыка «Па-за часам».**
**16.00** «Мультпарад». «Здаравяка».
**16.20** «Адшукваецца адпачынак».
**16.50 Драма «Мяцеліца».**
**18.10 Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Трылер «Партнёры».**
**23.10 Серыял «Сіндбад».**

### ВТБ

**6.00, 14.10** Серыял «Варонiны». (12+).
**8.00** «Ералаш». (6+)
**8.30, 4.20** М/ф «Тры каты». (0+)
**8.50, 4.40** М/ф «Фіксікі». (0+)
**9.10, 5.00** М/ф «Маша і Мядзведзь». (0+)
**9.30** Серыял «Дах свету-2». (16+).
**10.30** Камедыя «Усё магу». (12+).
**12.20** Скетч-шоу «6 кадраў». (16+).
**12.40, 1.35** «Дурні і дарогі». (16+).
**13.10** Серыял «Мамачкі». (16+).
**16.20** Серыял «Закрытая школа-4». (16+).
**17.20, 3.50** Серыял «Гэта каханне». (16+).
**17.50** «Імперыя ілюзій: браты Сафронавы». (16+).
**19.40, 22.45** «Уральскія пельмені». (16+).
**21.00** Камедыя «Забойныя канікулы». (16+).
**0.00** Жахі «Прыстанак зла: апакаліпсіс». (16+).
**1.50, 5.10** Серыял «Метад Лаўровай». (16+).
**2.40** «Лаві момант». (16+).
**3.00** «Не можа быць!» (16+).

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.20** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15** «Каломба». Серыял.
**12.30** «Вышыня. Норман Фостэр». Дак. фільм.
**13.10** «Раманавы. Асабістыя хронікі стагоддзя». Дак. серыял.
**13.40** Да 95-годдзя Маскоўскай філармоніі. «Музыка нашага кіно». Юрый Сіманаў і Акадэмічны сімфанічны аркестр Маскоўскай філармоніі. Запіс 2016 года.
**15.10** Жыццё выдатных ідэй. «Машына часу: фантазіі мінулага ці фізіка будучыні?»
**15.35** «Сакрэты Калізея». Дак. фільм.
**16.30** «Спыніся, імгненне!» Дак. фільм.
**16.55** «Вечны кліч». Серыял.
**18.15, 23.00** Сусветныя скарбы.
**18.35** «Дом на Гульвары». Дак. фільм.
**19.45** Смеханастальгія.
**20.15** Ступені цывілізацыі. «Сакрэты Калізея» Дак. фільм.
**21.05** Вялікая опера — 2016.
**23.35** «Сіндбад». Маст. фільм (16+).
**1.05** «Трыумф джаза».

### Настальгія

**6.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Гісторыя Алімпіяды-80». 2005 год (12+).
**7.05, 8.25, 9.40, 14.45, 15.40, 18.45, 20.45, 21.40, 23.30, 2.20, 3.40, 5.10** Музычная настальгія (12+).
**7.30** Фільм-спектакль «Аграбленне апоўначы». 1978 год (16+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР». (12+).
**11.00, 17.00** «КВЗ-87—88». Каманды НДУ і 1-га ЛМІ. (12+).
**12.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2008 год (16+).
**13.00** Тэлеспектакль «Ну, публіка!» 1976 год (16+).
**18.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1960. 1-я частка. (16+).
**18.55** Маст. фільм «Таня». (16+).
**23.05** Серыял «33 квадратныя метры. Дачныя гісторыі». (16+).
**0.00** Маст. фільм «Амаль смешная гісторыя». (16+).
**5.35** Маст. фільм «Страказіныя крылы». (16+).

### EuroSport 1

**4.00, 7.00, 11.00, 19.00, 21.30, 1.35** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны.
**5.30, 9.30, 13.00, 21.00, 23.50, 2.30** Веласпорт. «Тур дэ Франс».
**12.00** Веласпорт. «Тур дэ Франс» з Грэгам Лемондам.
**13.00, 18.45** Веласпорт. «Тур дэ Франс»-экстра.

### Кінакамедыя

**0.30** Камедыя «Дублёр». (16+).
**2.05** Меладрама «Спачатку каханне, потым вяселле». (16+).
**3.40, 14.20, 16.00** «Камедыянты (Шоу)» (16+).
**4.20** Камедыя «Вяселлі і іншыя непрыемнасці». (16+).
**6.00** Камедыя «Паліцэйская гісторыя». (12+).
**7.50** Камедыя «Паліцэйская гісторыя-2». (12+).
**9.55** Драма «Канікулы мары». (12+).
**11.40** Драма «Па версіі Барні». (16+).
**14.00, 14.50, 16.40** Скетчкам «Паміж намі». (16+).
**14.15** Камедыя «Уніз па лесвіцы». (16+).
**17.10** Камедыя «Трое ў лодцы, калі не лічыць сабаку». (12+).
**19.30** Камедыя «Замарожаны». (12+).
**21.00** Камедыя «Бінга Бонга». (16+).
**22.55** Камедыя «Оскар». (12+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**7.30** «Шафа» (16+).
**8.20** «Доктар І...» (16+).
**8.50** «Падарунак лёсу». Серыял (16+).
**10.30, 3.40** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**12.10** «Сляпая» (12+).
**13.10** «Варажбітка» (12+).
**14.15** «Паралельны свет» (12+).
**15.15** «Трэндзі» (16+).
**15.45** «Здзелка» (16+).
**16.15, 2.30** «Рыжыя» (16+).
**17.10, 5.10** «Людзі пятніцы» (16+).
**18.10, 1.40** «Бітва салонаў» (16+).
**19.10, 0.50** «Жанна, пажані» (16+).
**20.10** «Мама MIA». Камедыя (16+).
**22.10** «Савецкія мафіі» (16+).
**23.00** «Тэрмінатар». Баявік (16+).

### ТБ1000

**8.10** Правілы здыму: метад Хітча (12+).
**10.30** Вёска праклятых (16+).
**12.30** Найлепшае ўва мне (12+).
**14.50** Пераправа (16+).
**17.25** Гадзіла (12+).
**20.10** Апантанасць (16+).
**22.20** Вялікі ўсплёск (18+).
**0.45** Сенсацыя (16+).
**2.40** Труп нявесты (12+).
**4.10** Прыстанак праклятых (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Афінскія вечары (16+).
**8.15** Тата (12+).
**10.10** Зусім не простая гісторыя (16+).
**12.20** Саламяны капялюшык (12+).
**14.55** Суперменеджар, або Матыка лёсу (16+).
**16.30** А ранкам яны прачнуліся (16+).
**18.25** Слон (12+).
**20.20** Хатабыч (16+).
**22.20** Сволачы (16+).
**0.20** Кур'ер з «Раю» (12+).
**2.20** Няўлоўныя: Бангкок (16+).
**4.20** Шпіён (16+).

### National Geographic

**6.00** Займальная навука. (12+).
**6.50, 14.10, 5.35** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**8.05, 10.20, 14.55** Мегазаводы. (12+).
**8.50, 11.05, 15.40, 19.30, 0.05, 2.25** Міжнародны аэрапорт Дубай. (12+).
**9.35** Сапраўдны суперкар. (12+).
**12.40, 18.45, 21.50, 1.40, 4.45** Космас: прастора і час. (12+).
**13.25** Гульні розуму. (12+).
**18.00, 21.00, 0.50, 3.55** Асушыць акіян. (16+).
**20.15** Аўта-SOS. (12+).
**22.35** Ліхтугі за мяжой. (16+).
**23.20, 3.10** Секунды да катастрофы. (16+).

### Discovery

**8.00, 14.00, 18.00, 0.00, 3.50** Зорнае выжыванне. (16+).
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена? (12+).
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена? (12+).
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Паляўнічыя на рэліквіі. (12+).
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Паляўнічыя на склады. (16+).
**11.00** Аляска: сям'я з лесу. (16+).
**17.00, 22.00, 6.20** Махінатары. (12+).
**19.00, 2.00** Бітвы робатаў. (12+).
**20.00** Скарб Купера. (12+).
**2.55** Загадкі планеты Зямля. (16+).
**4.40** Маланкавыя катастрофы. (16+).

■ Простая мова

# ВАЖНА — ЛЮБІЦЬ...

**...Баба Люда ў людзі выбіраецца зрэдку. Яно і не дзіва: хваробы, гады. Да таго ж прадукты машына прывозіць дахаты, у краму не трэба хадзіць. Трэба (гэта святое!) — толькі ў касцёл, раз на тыдзень, у нядзельку.**

**Але ж днямі і ў суботу некуды ішла. Аказалася — на аўтобусны прыпынак. «Дзяўчына, дачка мая, пазваніла. Сказала, што раніцай сёння прыедзе. Іду сустракаць», — паведаміла жанчына. Ёй далёка за 80. Дачцэ — трэба разумець — за 60. Але для маці яна ўсё роўна *дзяўчына*.**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## КРУТА!

Тата (светлай памяці!) некалі казаў, што няма горшай балесці, як хочацца есці. А калі да гэтага ні прадуктаў, ні часу...

Зрэшты, перабольшваем: цеста на аладкі ў нас было.

Паспрабавалі цыркацца, пячы іх, але нават на дзвюх патэльнях справа ішла марудна: прыйшлося перайсці на бліны.

— Во, у вас нешта новае? — спытала суседка, «падцягнуўшыся» на пах. — Прасначкі?! Далібог... Вачам не веру! А малая ж некалі ела... Мама пякла...

Як высветлілася, усё новае і насамрэч добра забытае старое, тобок нашы продкі пяклі праснакі — з жытняй мукі на содзе і сыроватцы, з тоўчанай бульбы, з «крута замешанага цеста на бліны».

У нас, шчыра кажучы, яно было не зусім такое — то-бок замешанае не вельмі «крута»? Але ж усе пад'елі, а гаспадыні прытым яшчэ і заўважылі, што часу на выпечку пайшло меней, алею і газу — таксама. А значыць, праснакі — гэта ўсё-такі крута!

## БЫЎ СТЫМУЛ — І ЗНІК

Пахудзець спрабавалі многія...

І чаго тады не рабілі: сядзелі на дыетах, не елі пасля 18, бегалі цёпла адзеўшыся, плавалі, пілі шмат вадкасці...

У Каці быў свой адмысловы спосаб пахудзення: яна купляла...

Не, не скакалку, не лыжы, а... новую прыгожую сукенку альбо спадніцу.

Дома гэта абноўка (што важна — 46-га памеру, а не патрэбнага ёй 48-га) вешалася на кухні бліжэй да халадзільніка. І там самым вымушала гаспадыню пастаянна выбіраць, чаго ж ёй хочацца больш: нешта з'есці альбо пахудзець, каб прыбрацца-такі ў новае?

...Вось гэта, другое жаданне, як правіла, перамагала: Каця — нічога не скажаш — выглядала, што трэба! Раней. Цяпер — пашырэла... І нават нашмат:

— Трэці год 50-ы памер нашу, — уздыхае жанчына. — Пахудзець ну ніяк не ўдаецца: дочкі выраслі — усе абноўкі, значыцца, ім. А я (і ў старым) — толькі папраўляюся.

## БЕЗ БАБКІ

З лесу дзядзька Валодзя з пустым кашом не прыходзіць — вечна нешта нясе: то грыбы, то ягады, то нейкія травы...

Не пашчасціла хіба нядаўна: першае, з надвор'ем, а па-другое, — анічогачкі не знайшоў, як сказала жонка: «аніводненькай бабкі!»

— Дык ты радуйся, — суцешыў яе сусед, — а то падвернецца якая (у лесе ды пагодным днём), і прапаў мужык: можа, і дадому ці вернецца.

І сапраўды, бабкі яны такія... Асабліва цяпер.

## СУЦЯШЭННЕ

«...Ну, што вам людзі пішуць?» — час ад часу пытае каляжанка, бо гэта ёй і сапраўды цікава.

А значыць, можна расказаць, што, апроч іншага, у рэдакцыю прыйшоў артыкул пра жыццё і творчасць Міцкевіча — з яго вершамі, з завочнай экскурсіяй па ўлюбёных мясцінах, з паўтарэннем наказу Багушэвіча «Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!»

І ўсё гэта — на адрас «Звязды», у вялікім канверце, падпісаным... паруску.

— Ну чаму? — пытаю ў каляжанкі.

— А назва газеты хоць праз «я» напісана, ці праз «е»? — пытае ў мяне яна.

— Праз «я», здаецца?

— Ну, тады не ўсё яшчэ страчана...

Умее суцешыць.

## ШУКАЙ ДЗЯЎЧЫНУ!

Беларускую мову (так склалася) Алег не вывучаў. А значыць, ніколі на ёй не чытаў, не пісаў, само сабой — не размаўляў. Але ж, дзякаваць Богу, слухаў і — што важна — разумеў, ва ўсякім разе, не цадзіў праз зубы, што ў нас, маўляў, дзве дзяржаўныя і размаўляць па-беларуску яго ніхто не прымусіць... Як быццам, вельмі трэба нам — некага прымушаць: можа — як той самы Алег — самі загавораць. Ды гэтак жа добранька! Вушам не паверыла, спытала ў хлапца, дзе ж гэта што здохла?

Ён ахвотна растлумачыў, што з паўгода сустракаецца з дзяўчынай. Яна — лінгвіст, добра ведае іспанскую, англійскую і рускую мовы, а вось размаўляе — на сваёй, на роднай, прычым з усімі... І, вядома ж, з ім. Вось ён і прыламаўся, падабаецца...

Калі падабаецца дзяўчына.

Дзе б іх толькі набраць, тых дзяўчат, каб хапіла на хлопцаў.

## «Я САМА...»

На працу Марусю праводзіць матуля (яны ўдзвюх жывуць): гатуе сняданак, збірае з сабой на перакус, глядзіць, якое надвор'е, каб параіць, што надзець і абуць, сочыць, каб тая не забылася ключ ад кабінеціка, тэлефон, праязны...

Карацей, «дастае» дачку сваім залішнім клопатам, і тая зрэдчас зрываецца: крычыць, што яна сама з усім разбярэцца, што не маленькая ўжо, не дурная, што хопіць...

Ну сапраўды: дзеўцы 33-і ўжо, з адукацыяй, нават з пасадай... Значыць, маці можа пакінуць яе адну — на лета з'ехаць на дачу? Маруся ж справіцца?

...Прачнулася днямі, паглядзела ў акно, падумала, што, выходзячы з дому, трэ будзе ўзяць парасон.

Не, яна не забылася: на вуліцы раскрыла (дождж ішоў), без праблем дабегла да прыпынку, а зайшла ў трамвай і адчула дзіўныя позіркі.

Падумала, з чаго б гэта, і ўбачыла, што адзін парасон — толькі што згорнуты, мокры — трымае ў правай руцэ, а другі — матулін, сухі — разам з сумкай у левай.

## «РУХАВІК ГАНДЛЮ»

Горад, скрыжаванне, падземны пераход — з безліччу людзей (асабліва пад вечар), з добрым дзясяткам розных крамаў і ці не сотняй гандляроў-прыватнікаў.

— Па-мі-доры! — гучна выкрыквае цыбаты, чарнявы дзяцюк. — Херсонскія памідоры.

Ну і няхай сабе: мы ля іх не спыніліся б, не куплялі б (бо гародніна дома ёсць), але ж побач з гэтым дзяцюком — за нейкі метр — стаіць яшчэ адзін і... умінае той вялізны, чырвоны, сакаўны памідор. Умінае з такім апетытам, за абедзве шчакі, што...

Давялося вярнуцца, купіць і потым са смакам з'есці, дзякуючы рэкламе.

## СПАДЧЫНА

...Ліда ўсё жыццё крыўдавала на бацьку: маўляў, кінуў яе маленькую.

І сапраўды, ён зрабіў зусім не палюдску: з невядомага якой прычыны ў свае 23 звёў рахункі з жыццём, пакінуў дачку.

У выніку сама яна, можна сказаць, гаравала-гадавалася (маці глядзела меншых дзяцей, ад новага шлюбу), сама затым выбівалася ў людзі.

І такі ж змагла: абараніла дыплом і кандыдацкую дысертацыю, стварыла сям'ю, пабудавала кватэру і дачу, абжылася... Без бацькі, без спадчыны.

Ці яна ўсё ж... была: у выглядзе генаў — генаў працавітасці і ўпартасці, генаў любові да людзей, да жыцця.

## ВАЖНА — ЛЮБІЦЬ

...Нейчае маладое, відаць, не трэніраванае пачуццямі сэрца не змясціла пачуццяў: фарбай на асфальце пад вокнамі вывела: «Варя, я люблю тебя».

Першае слова (імя) пісалася, мусіць, вельмі нясмела, на апошняе — бракавала фарбы. А таму праз год на асфальце засталося толькі сэрца ды галоўнае слова: «Люблю!»

Закаханаму дастаткова?

**Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

■ Неасабісты суб'ектыў

# БЯССОННЕ Ў ЛЕТНЮЮ НОЧ



## Што можна ўбачыць на цёмнай вясковай вуліцы

ДЗЕНЬ Незалежнасці сёлета адзначалі спакойна і па-сямейнаму — у вясковым двары, з шашлыкамі, добрым вінОм і цёплай душэўнай размовай аб усім і ні аб чым, якую могуць нязмушана весці толькі сапраўды блізкія людзі. Падзівіўшыся на мінскі салют на тэлеэкране, вырашылі са стрыечнай сястрой прайсціся па вясковай вуліцы. Яна ў нас фактычна адзіная і ёсць (калі не лічыць пару хат на невялікіх апендыксах па баках, якія спрадвеку паблажліва завуцца Прыцапілаўкай). Вуліца доўгая — кіламетры два з паловай, да таго ж тупіковая — выехаць з вёскі можна толькі па тым жа шляху, што і ўехаў, асабліва калі казаць пра машыну, бо для пешага ці коннага дарога наўпрост па полі, па лесе і нават цераз рэчку заўсёды пры патрэбе знойдзецца. Карацей, жывучы ў адным канцы вёскі, ды яшчэ і ў тым, дзе крама, нават тутэйшыя бываюць на супрацьлеглым канцы рэдка. Што ўжо казаць пра вяскоўцаў «сезонных», якія прыязджаюць толькі на выхадныя ці ў лепшым выпадку на пару тыдняў водпуску. Таму кожную суботу на нашай вуліцы пад вечар можна сустрэць падобных разявак-экскурсантаў — ідучы па роднай вёсцы, яны з непадробнай цікавасцю зазіраюць у двары, разглядаюць кветкі на клумбах. (Сёлета, напрыклад, дзяўчаты-зямлячкі ў сацыяльных сетках замучылі мяне пытаннем, што гэта за дзіўосны падобны да каліны куст цвіце ў нас каля лаўкі...)

Карацей, у той вечар на экскурсію, якой не праводзілі з мінулага лета, выправіліся і мы. Ішлі павольна ў лёгкай ліпеньскай цемры, якая і не цемра зусім, разважалі пра тое, што ёсць рэчы, якія не мяняюцца з дзесяцігоддзямі, — і месяц, які вось-вось пакажацца з-за шабаравай бярозы, і гэты дзівосны пах разнатраўя, і кугакание савы дзесьці ў рачных вербалозах за агародамі. Але ў гэтай спрадвечнай ідыліі найбольш яскрава відаць, як змяняецца іншае — вёска, людзі, норавы.

УЖО ў дванаццаць гадзін вечара (дзіцячы час для вясковага лета!) на вуліцы, дзе не гарыць ні адзін ліхтар — адключылі на сезон светлых начэй, — ціха і вусцішна. Няма ў вокнах святла — стомленыя з непрывычкі агароднай працай дачнікі ўжо спяць без задніх ног. На лаўках, што сіратліва прытуліліся ля платоў, — ні моладзі, ні падлеткаў. (А яшчэ гадоў пяць назад ці не на кожнай сядзела група ці парачка, і пры набліжэнні дарослых «экскурсантаў» яны насцярожана прыціхалі.) Усе летнія вечары — а нярэдка і цэлыя ночы — і вясковыя, і прыезджыя трынаццаці-шаснаццацігадовыя праводзілі на вуліцы, на гэтых лаўках. Думаю, не памылюся, калі скажу, што кожнаму з іх дакладна ёсць што ўспомніць. Першыя нязграбныя заляцанні, нясмелыя пацалункі, песні пад гітару, жарты і гульні — гэткая добрая жыццёвая школа ўзаемаадносін палоў. Шчыра, я часам задумваюся: а дзе вучацца пачуццям і пяшчоце сучасныя падлеткі? У сацыяльных сетках? У камп'ютарных гульнях? Яны ж проста або баяцца знаёміцца са сваімі не віртуальнымі — рэальнымі — равеснікамі, або, наадварот, паводзяць сябе жорстка і нахабна, не разумеючы, што яны не ў гульні, дзе заўсёды можна націснуць кнопку «адмяніць» і пачаць усё нанава...

ЛІТАРАЛЬНА за некалькі гадоў вёска з тыповай для цэнтральнай Беларусі забудовы са зграбнымі хатамі двума-тырма вокнамі на вуліцу, акуратнымі драўлянымі агароджамі ператварылася ў выстаўку архітэктурных вычварэнняў. Высокія платы з металапрофілю — гэта яшчэ палова бяды. Хаця я тут цалкам згодна з нашым мясцовым бабылём Вітакам, які, ідучы дадому нападпітку, спыніўся ля аднаго такога плота і філасофстваваў: «Паадгароджваліся ад людзей — пэўна, маюць што хаваць»... Самае сумнае відовішча сучаснай вёскі — пакалечаныя спадчыннікамі хаты. Іхнія бацькі-дзяды, якія гэтыя хаты будавалі, нават у страшным сне, пэўна, не маглі ўявіць, што дзеткам-унукам стане цесна ўваходзіць праз адны сенцы, гатаваць на адной кухні. А дзеткам-унукам цесна. І пасля смерці старэйшых родныя браты і сёстры пачынаюць хату дзяліць. Як правіла, удоўж. Тыя, каму не пашанцавала атрымаць ва ўласнасць адзіны ўваход, прарэзаюць дзверы і дабудоўваюць сенцы з процілеглага боку. З блокаў, абіваюць вагонкай або сайдынгам. Як скула вырастае на баку ў вясковай хаткі. Добра яшчэ, калі на плошчы падзелу толькі два акны — кожнаму па адным. Калі тры — усё дзеліцца па справядлівасці: кожнаму па паўтара — сярэдняе напалову. Далей — болей: хтосьці са спадчыннікаў багацейшы і пачынае сваю палову аздабляць: можа новымі дошкамі абабіць, можа цэглай абкласці, а то і дгі паверх дабудуе (а яшчэ нядаўна ўбачыла, як тое ж і з плотам ад вуліцы зрабілі: палова новага, палова старога — акурат па лініі падзелу). І вось ужо стаіць не хата — крывабокая падслепаватая пачвара, у якой бавяць час дачнікі, якія калісьці, пэўна, у мінулым жыцці, былі самымі блізкімі людзьмі. І з кожным годам такіх хат большае...

У шэрым змроку на свае вочы ўбачылі і наступствы надзвычайнага здарэння, аб якім колькі дзён назад гаварыла ўся вёска. На вузкай вуліцы не размінуліся пагрузчык і легкавушка, пагрузчык узбіўся на павеку, выкарчаваў дрэва. Прыязджала міліцыя, разбіраліся, а мясцовыя кабеты, замест таго каб самім прымчаць на месца падзей (як рабілі гэта яшчэ гадоў дзесяць назад), схапіліся за мабільнікі і пачалі званіць цётцы Марыі, якая жыве побач з месцам аварыі, — яна ў той дзень была галоўным ньюсмейкерам, з задавальненнем расказваючы ўсім ахвотным падрабязнасці.

ПРЫЦЯГНУЛІСЯ дадому разбітыя і стомленыя. Ці то ад таго, што позна было, ці ад выпітага віна, а можа, яшчэ па якой прычыне ўзнёслы настрой таго добрага святочнага вечара кудысьці знік. Праўда, ненадоўга: сонца, якое ўжо а палове шостай засвяціла ў шыбу, безапеляцыйна пачынала новы дзень.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

УДАЧНИК

# РЕЗУЛЬТАТЫ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «ПРИДИ, КУПИ И ВЫИГРАЙ!»

**Сведения об организаторе:** Общество с ограниченной ответственностью «Акватехнологии», УНП 190369265; Республика Беларусь, 220070, г. Минск, ул. О. Кошевого, д. 5, оф. 1.

**Наименование рекламной игры:** «Приди, купи и выиграй!»

**Территория проведения рекламной игры:** на территории Республики Беларусь в магазинах «Удачник» (ООО «Акватехнологии») и интернет-магазине www.ydachnik.by.

